ПРАЛЕТАРЫ УСІХ КРАЁЎ ЗЛУЧАЙЦЕСЬ!

ЗЬВЯЗДА

Орган Цэнтральнага і Менскага Камітэтаў Камуністычнай Партыі (б) Беларусі

№ 1 (3409) Серада 1 студзеня 1930 г.

Адрас рэд. і канторы: Менск, Савецкая, 63.
ШТОДЗЕННАЯ ГАЗЭТА, ГОД ВЫДАНЬНЯ XIII
Тэлефоны: рэдактар—1074, сакратар—619,78 кантора—1.

Бібліотека Мін. Горкома

БІБЛІОТЕКА МЕНГІСТАРХІВА № 59

Вызваленьне з кітайскіх турам 3000 сарэнных грамадзян

ТОКІЁ, 30. Як паведамляе. Харбінскі карэспандэнт агенцтва „Сімбун Рэнго", у аўторак, 31 сьнежня, кітайскімі ўладамі будуць вызвалены пасьля пяцімесячнага зьняволеньня ў Харбінскіх турмах 3.000 савецкіх грамадзян.

БАРЫСАЎ, Вярбоўка рабочых у калгасы у лік 25000 у Барысаве ідзе пасьпешна. За адзін дзень вярбоўкі запісалася—130 чалавек. З заводу імя Домбаля запісалася 93 чал.

Патрэбен карэнны пералом!

Сёньня мы друкуем матар'ялы аб становішчы з сабекоштам у беларускай прамысловасьці. Гэтыя матар'ялы заслугоўваюць асаблівае ўвагі з боку ўсяе нашае савецкае грамадзкасьці. Дырэктывы парты і аб 11-проц. зьніжэньні сабекошту пад пагрозай невыкананьня

Праўда, яшчэ няма даных, якія падагульваюць вынікі барацьбы за зьніжэньне сабекошту па ўсёй прамысловасьці. Аднак, асобныя паведамленьні, якія ёсьць аб працы асобных галін прамысловасьці, гавораць аб вялікіх, недапушчальных зрывах. Па папяровай прамысловасьці замест 12,2% сабекошт зьніжаны ў кастрычніку на 7½%, а ў лістападзе нават на 4%. Па мэталёвай прамысловасьці замест 14,7%—толькі на 6%, па швэйнай — 7,3% замест 10% і г. д.

Па асобных прадпрыемствах іншых галін прамысловасьці становішча нават значна горшае. Гомельская абутковая фабрыка замест праграмных 20% зьнізіла сабекошт на 2,4%, запалкавая фабрыка «Днепр» замест 13,6%—0,35% і г. д.

Некаторыя прадпрыемствы **павысілі** нават сабекошт у параўнаньні з мінулым годам. Напрыклад, маслабойны завод «Адзярыха» павысіў сабекошт на 5,3%. Рэкорд пабіла папяровая фабрыка імя Сталіна, якая **павялічыла** сабекошт на 15,5% замест **зьніжэньня** сабекошту на 14%.

У чым-жа прычыны такіх значных зрываў?

Гаспадарнікі часта спасылаюцца на аб'ектыўныя прычыны. Гэтыя спасыланьні пягруптоўныя. Справа не ў аб'ектыўных прычынах, а ў тым, **што ні гаспадарнікі, ні прафсэкыянальныя арганізацыі не перабудавалі свае работы ў адпаведнасьці з новымі вялізнымі задачамі, якія пастаўлены другім годам пяцігодкі.** Ня была мабілізавана ўвага рабочых на гэтым важнейшым вучастку гаспадарчай работы. Са справаздачы, якая друкуецца сёньня ў «Зьвязьдзе» аб пасяджэньні старшынь ЦП саюзаў, чытач даведваецца, што **адказныя прафработнікі самі прызнаюць, што прафарганізацыі ў апошнія месяцы прайшлі міма пытаньняў, зьвязаных з выкананьнем прамфінплянаў.** Аб недапушчальна нядбайных адносінах некаторых гаспадарнікаў гаворыць хаця-б той факт, што, ня гледзячы на пастанову ЦК УсеКП(б), яны не падаюць штомесячных калькуляцый, што не дае магчымасьці выявіць поўны малюнак з сабекоштам па беларускай прамысловасьці.

Надзвычай слаба ахапляецца прафсаюзамі той масавы пад'ём працоўнай актыўнасьці рабочых мас, сьведкамі якога мы зьяўляемся. Мы ўжо паведамлялі ў «Зьвязьдзе», што прафарганізацыям **нічога не вядома аб ходзе сацыялістычнага спаборніцтва ў першыя месяцы новага гаспадарчага году.** Слабае кіраўніцтва спаборніцтвам затрымлівае далейшы рост гэтага руху. Між тым магчымасьці ў гэтым напрамку вельмі вялікія. Па 45 прадпрыемствах ВСНГ ударнымі брыгадамі ахоплена 30% рабочых. Ёсьць шмат прадпрыемстваў, якія зусім прайшлі міма ўдарніцтва і на каторых няма ні аднае ўдарнае брыгады.

Успамянем пастановы апошняга пленуму ЦК УсеКП(б(). Вось, што гаворыцца ў іх па пытаньні аб сабекошце:

«Пленум ЦК падкрэсьлівае бязумоўную абавязковасьць зьніжэньня сабекошту прамысловай прадукцыі на 11%, лічыць гэта заданьне аднэй з важнейшых і асноўных дырэктыў усяго пляну гаспадарчага разьвіцьця на 1929-30 год... Абавязаць усе мясцовыя партыйныя, савецкія і прафсэкыянальныя арганізацыі ўжо **ў першым квартале** (падкрэсьлена намі.—**Рэд.**) разгарнуць такі тэмп работы для ажыцьцяўленьня гэтай дырэктывы, які поўнасьцю-бы забясьпечыў яе выкананьне».

Такім чынам мы можам канстатаваць, што дырэктыва, якую пленум ЦК УсеКП(б) прызнаў аднэй з важнейшых і асноўных, **ня выконваецца.**

Патрэбен карэнны пералом! Барацьба за зьніжэньне сабекошту, за выкананьне прамфінпляну **павінна стаць у цэнтры ўвагі нашых партыйных, савецкіх, прафсэкыянальных арганізацый і прэсы.**

Мабілізацыя мас, рашучы зрух у рабоце гаспадарнікаў і прафарганізацый, **безадкладнае паляпшэньне кіраўніцтва сацспаборніцтвам,** барацьба за павышэньне прадукцыйнасьці працы, **за рацыяналізацыю вытворчасьці,** барацьба са стратамі, бракам, — усё гэта дасьць нам магчымасьць ня толькі нагнаць упушчанае, але і перавысіць плянавыя заданьні.

Рэвалюцыйны рух у Індыі ўзмацняецца

ЗГОДНІКІ ПРЫМУШАНЫ ВЫСОЎВАЦЬ РЭВАЛЮЦЫЙНЫЯ ЛЁЗУНГІ

Чырвоны сьцяг--на пасяджэньні кангрэсу

ЛЁНДАН, 29. Апублікаваны тэкст праекту рэзалюцыі, прынятае падрыхтоўчай камісіяй нацыянальнага кангрэсу, які адкрыўся 30-га сьнежня, аказаўся значна больш радыкальным, чым можна было меркаваць. Яшчэ ў панядзелак Ганды, Нэру і інш. лідэры былі гатовы да адкрытага супрацоўніцтва з брытанскімі ўладамі. Нарада з віцэ-каралём, на якой меркавалася абгаварыць пытаньне аб алмове ад байкоту камісіі Саймона, закончылася безвынікова, бо да гэтага часу ўжо высьветлілася, што **вялізарная большасьць дэлегатаў на кангрэсе пад націскам мас настроена супроць супрацоўніцтва.** Ганды і Нэру пагражала застацца ў хвасьце руху. Таму ім прышлося перайсьці да больш радыкальнае тактыкі, якая дазволіла-б ім утрымаць кангрэс пад сваім уплывам.

Пры ўсім сваім знадворным радыкалізьме рэзалюцыя носіць досыць неакрэсьлены характар. З аднаго боку, выказваецца «ўхвала намаганьням віцэ-караля да мірнага вырашэньня канфлікту», а з другога — заяўляецца, што наладжаньне шырокае нарады ня дасьць карысьці. Далей рэзалюцыя ўстанаўляе, што **асноўным** лёзунгам свараджыцкае партыі зьяўляецца патрабаваньне **поўнае незалежнасьці Індыі** і што распрацаваны Нэру плян наданьня Індыі праву дамініёна зьяўляецца **памылковым;** але адначасова рэзалюцыя **фактычна адмаўляецца ўжыць у якасьці зброі байкот.** Сапраўды, згодна рэзалюцыі кангрэсу мінулага году, байкот павінен пачацца з 1-га студзеня; зараз-жа гэту пагрозу мяркуецца ажыцьцявіць, калі выканком кангрэсу «будзе лічыць гэту меру адпаведнай», і то высоўваецца пэрспэктыва правядзеньня яе «ў поўных раёчах». Такім чынам, выканком пакідае сабе досыць пералазаў на той выпадак, калі рэзалюцыя будзе прынята кангрэсам.

Ганды палічыў нават патрэбным высьветліць, што з прыняцьцем рэзалюцыі зусім не зьнішчаецца ўсякая магчымасьць наладжаньня канфэрэнцыі з прадстаўнікі ўраду і што камітэт кангрэсу ўладае «поўным выканаўчым аўтарытэтам» для перагляду палажэньня ў выпадку ўзьнікненьня новых акалічнасьцяй. Ганды, відавочна, надаў сваёй рэзалюцыі радыкальную афарбоўку толькі для таго, каб лягчэй перамагчы левае крыло. Між іншым «лявізна» крайняга крыла ня так ужо небясьпечна для брытанскага панаваньня ў Індыі. Гэта з поўнай яснасьцю вызначылася 30-га сьнежня, калі Ганды ўнёс рэзалюцыю з асуджэньнем апошняга замаху на віцэ-караля. Левым прышлося ўзяць назад свае дадаткі да гэтай рэзалюцыі, калі Ганды заявіў, што яны павінны выразна сказаць, ці стаяць яны за гвалтоўныя дзеяньні, ці за правядзеньне нацыянальных мэтаў мірным шляхам. У выніку рэзалюцыя Ганды была прынята большасьцю ў 48 галасоў.

Радыкальная рэзалюцыя з патрабаваньнем незалежнасьці выклікала выбух абурэньня ў ангельскай прэсе. Друк на чале з умерана кансэрватыўнай «Дэйлі Экспрэс» патрабуе «цьвёрдае рукі» і спыненьня «пустых абяцанак». Нават лібэральная «Манчэстэр Гардыян» гаворыць аб патрэбнасьці рэпрэсый. «Таймс» і «Дэйлі Гэральд» выказваюцца за патрэбнасьць настойлівае дамагацыя супрацоўніцтва з індыйскім нацыянальным рухам.

Выканком кангрэсу ўхваліў рэзалюцыю Ганды

ЛЁНДАН, 30. Агэнцтва Рэйтэр паведамляе з Лагоры: «На ўчарайшым пасяджэньні выканкому Індыйскага нацыянальнага кангрэсу Ганды атрымаў нязначную большасьць (131 голас супроць 89), якою была прынята яго рэзалюцыя супроць папраўкі лідэра левых Боза. (Папраўка Боза заключалася ў патрабаваньні поўнага разрыву з Англіяй). Настрой дэлегатаў яскрава выявіўся ўчора ў воклічах: «Няхай жыве рэвалюцыя», «Далоў ангельскі блёк, няхай жыве нацыянальны», якія раздаваліся на пасяджэньні Выканкому, пасьля таго, як Нэру скончыў сваю прамову.

***

ЛЁНДАН, 30 Выканком індыйскага нац. кангрэсу большасьцю 114 галасоў супроць 113 адхіліў папраўку дэлегата Кэлькара, якая прапанавала выключыць з рэзалюцыі Ганды фразу, дзе аддаецца належная ўвага ініцыятыве віцэ-караля, які склікае ангельска-індыйскую канфэрэнцыю.

ЛЁНДАН, 31. Як падае агэнцтва «Рэйтэр», усеіндыйскі нацыянальны кангрэс у Лагоры пасьля спрэчак, якія цягнуліся паўтары гадзіны, большасьцю 942 галасоў супроць 792 прыняў рэзалюцыю Ганды, якая асуджае замах на віцэ-караля і віншуе віцэ-караля і яго жонку з выратаваньнем ад небясьпекі. **У часе спрэчак студэнты разгарнулі чырвоны сьцяг у знак пратэсту супроць рэзалюцыі.**

Паўстаньне супроць ангельскага імэрыялізму

ЛЁНДАН, 30. Агэнцтва Рэйтэр паведамляе з Вэлінтону (Новая Зэляндыя): «У выніку сутычак паміж тубыльцамі і паліцыяй у сувязі з дэманстрацыяй тубыльцаў 23 сьнежня ў Апіа (галоўны горад у архіпэлягу Самоа—ангельская калёнія на ўсход ад Аўстраліі) забіты адзін паліцэйскі і 6 паліцэйскіх лёгка паранены. Сярод тубыльцаў 8 забітых, 12 параненых. Прэм'ер нова-зэляндзкага ўраду Уорд заявіў, што паліцыя «ужыла агнястрэльную зброю толькі з прычыны крайняе неабходнасьцьці».

***

ЛЁНДАН, 31. «Рэйтэр» паведамляе з Вэлінтону (сталіца Новае Зэляндыі): «Адбылося пасяджэньне нова-зэляндзкага габінэту, прысьвечанае апошнім хвалаваньням тубыльцаў па Самоа (выс па Самоа знаходзіцца на ўсход ад Аўстраліі і на поўнач ад новае Зэляндыі). Пасьля пасяджэньня прэм'ер Уорд рашыў паведаміць ангельскую ўладу на Самоа, што ў выпадку новых наступальных дзеяньняў з боку тубыльцаў у распарадзэньне ўлады будуць дадзены любыя падмацаваньні, якія яна толькі патрабуе. Прэм'ер пры гэтым паўтарае, што нова-зэляндзкі ўрад будзе цьвёрда прытрымлівацца свайго намеру аднавіць законнасьць і парадак у Самоа.

Поўны склад польскага ураду

ВАРШАВА, 29. Абвешчаны новы склад польскага ўраду: **прэм'ер--Бартэль,** міністар унутраных спраў—**Юзэфскі** (былы Валынскі ваявода, вядомы сваімі агрэсыўнымі выступленьнямі супроць Савецкага Саюзу), замежных спраў—**Залескі,** вайсковых — **Пілсудзкі,** народнае асьветы—**Чарвінскі,** гандлю і прамысловасьці—**Кватюўскі,** аграрных рэформ—**Станевіч,** грамадзкіх работ—**Матасевіч,** працы—**Прыстар,** шляхоў зносін—**Кюн,** пошт і тэлеграфаў—**Бэрнэр.**

У якасьці кіраўнікоў міністэрствамі назначаны: фінансаў — **Матушэўскі,** юстыцыі—**Будкевіч,** земляробства—**Лясь неўскі.** У аўторак новы габінэт прымае прысягу.

Адозва ЦК УсеКП(б)

да ўсіх ЦК нацкампартый, акругкомаў, абкомаў і райкомаў КП(б)

Па пытаньні аб паляпшэньні кіраўніцтва пераводам прадпрыемстваў і ўстаноў на бесьперапынны вытворчы тыдзень

Пытаньне гэта зьяўляецца пытаньнем асабліва важным. Аднак, першыя шагі правядзеньня гэтага мерапрыемства, побач з асноўнымі станоўчымі вынікамі сьведчаць, што большасьць партыйных, прафсэкыянальных, гаспадарчых і савецкіх арганізацый надзвычай слаба вядзе растлумачальную работу ў масах аб значэньні і парадку ўвядзеньня бесьперапыннага вытворчага тыдню і не забясьпечвае своячаснага прыняцьця неабходных падрыхтоўчых мер. Па гэтай прычыне ў раде месц адзначалася ў пераходзе прадпрыемстваў невыстарчальная папярэдняя падрыхтоўка, слабае выкарыстоўваньне для гэтай мэты рабочых і служачых, надзвычайна марудны тэмп дзейнасьці культурна-асьветных устаноў, прыстасаваньне іх адпаведна да ўмоў работы і г. д.

Цэнтральны камітэт УсеКП(б) прапануе ўсім партыйным камітэтам прыступіць да фактычнага выкананьня на мясцох пастановы ЦК ад 17-га лістапада 1929 году аб бесьперапынным вытворчым тыдні, зьвярнуўшы асаблівую ўвагу на ажыцьцяўленьне наступных мерапрыемстваў:

1. Перавод прадпрыемстваў і ўстаноў на бесьперапынны вытворчы тыдзень павінен абавязкова адбывацца разам з увядзеньнем неабходных мерапрыемстваў, правільнага разьмеркаваньня на больш адказных вучастках работы, разьмеркаваньне дзён адпачынку павінна быць прыстасавана да асаблівасьцяй данага прадпрыемства і ўстановы і праводзіцца такім чынам, каб было забясьпечана сапраўднае павышэньне тэмпу і якасьці работы. Устанаўляючы аднастайны каляндар для прадпрыемстваў і ўстаноў, трэба так узгадніць дні адпачынку, зьвязаных паміж сабою ў працы паасобных работнікаў прадпрыемстваў і ўстаноў, каб унікнуць няўвязак і перабояў у рабоце. Пры гэтым павінны быць улічаны інтарэсы рабочых і служачых (узгадненьне дзён адпачынку членаў сям'і і г. д.).

Перавод устаноў на бесьперапынную работу абумаўляецца інтарэсамі паляпшэньня абслугоўваньня прадпрыемстваў і рабочых мас. Таму ўвядзеньне бесьперапыннага тыдня зьвязана з радам труднасьцяй, партыйныя камітэты павінны ўзмацніць растлумачальную работу ў масах і забясьпечыць арганізаваны пераход устаноў і прадпрыемстваў на бесьперапынную работу, сыстэматычна ставячы на абмеркаваньне практыку работы пры бесьперапынцы, узмацніць жывую сувязь і інструктаваньне ячэек прадпрыемстваў і ўстаноў, якія працуюць на бесьперапынцы, шляхам пасылкі ім на дапамогу кіраўнічых работнікаў, скліканьня нарад для абмену вопытам і распаўсюджваньня праверанных на практыцы мерапрыемстваў па зьніжэньні недахопаў.

2. Для выкананьня плянаў узьняцьця прадукцыйнасьці працы, паляпшэньня якасьці прадукцыі і паляпшэньня ўмоў працы на прадпрыемствах з бесьперапынным рабочым тыднем, гаспадарчыя органы абавязаны загадзя ўжыць патрэбныя меры да паляпшэньня вытворчасьці на азначаных прадпрыемствах.

3. Адначасова з пераходам на бесьперапынны вытворчы тыдзень трэба абавязкова палепшыць работу партыйных і прафсэкыянальных арганізацый, культурна-асьветных і бытавых устаноў стасоўна да новых умоў работы, не дапускаючы паслабленьня грамадзка-палітычнае работы і пагаршэньня матар'яльна-бытавых і культурна- асьветных запатрабаваньняў мас (пераход на 2-хзьменную работу, набліжэньне работы да вытворчасьці і інш.).

Асаблівую ўвагу трэба зьвярнуць на правільнае разьмеркаваньне камуністых і камсамольцаў.

З прычыны таго, што ўвядзеньне бесьперапыннага тыдня зьвязана з радам труднасьцяй, партыйныя камітэты павінны ўзмацніць растлумачальную работу ў масах і забясьпечыць арганізаваны пераход устаноў і прадпрыемстваў на бесьперапынную работу, сыстэматычна ставячы на абмеркаваньне практыку работы пры бесьперапынцы, узмацніць жывую сувязь і інструктаваньне ячэек прадпрыемстваў і ўстаноў, якія працуюць на бесьперапынцы, шляхам пасылкі ім на дапамогу кіраўнічых работнікаў, скліканьня нарад для абмену вопытам і распаўсюджваньня праверанных на практыцы мерапрыемстваў па зьніжэньні недахопаў.

200 камуністак на паўтарамесячны тэрмін у калгасы

Верасьнёўскі пленум ЦК КП(б)Б адзначыў, што слабая праца сярод жанчын на вёсцы часта перашкаджае калектывізацыі, бо кулацтва імкнецца скарыстаць больш адсталыя пласты бяднячак і сераднячак для зрыву калектывізацыі. Таму пленум завастрыў увагу ўсёй парт. арганізацыі на неабходнасьці ўзмацненьня парт. кіраўніцтва працай сярод жанчын і разгортваньня масавай работы. На сёнешні дзень побач з задачай па арганізацыі бяднякоў-сераднякоў мас сялянак для наступленьня на клясавага ворага за калектывізацыю вёскі, перад парт. арганізацыяй паўстае важнейшая задача — ацягненьне сялянак калгасьніц у справу гаспадарчага і культурнага разьвіцьця калгасаў.

Для больш шпаркага зруху ў працы з калгасьніцамі, узьняцьця ролі калгасьніцы ў калгасным будаўніцтве, ЦК КП(б)Б у дапамогу нізавым парт. арганізацыям накіроўвае 200 камуністак на паўтарамесячны тэрмін у раёны суцэльнай калектывізацыі і буйнейшыя калгасы.

Партарганізацыі на мясцох павінны сумесна з мабілізаванымі камуністкамі выявіць, арганізаваць актыў калгасьніц для настаноўкі сталай работы сярод сялянак як унутры калгасаў, так і за імі сярод бяднячак і сераднячак.

Да гэтага часу праца сярод жанчын у калгасах скарыстоўвалася ня поўнасьцю і, галоўным чынам, на абслугоўваньне сваёй сям'і і на падсобнай рабоце ў гаспадарцы.

Нізкая прадукцыйнасьць жаночай працы ў калгасах зьвязана з нізкай кваліфікацыяй жанчын і іх няпісьменнасьцю, і асабліва з слабым разьвіцьцём тых галін гаспадаркі, дзе найбольш якасна магчыма скарыстаць жаночую працу: жывёлагадоўля, малочная гаспадарка, агародніцтва, птушніцтва, ільнаводзтва і інш.

Нам зараз патрэбна мабілізаваць шырокую грамадзкую думку навакол справы ліквідацыі няпісьменнасьці і ўзьняцьця культурнага ўзроўню калгасьніц, што цесна зьвязана і з узьняцьцем кваліфікацыі.

Рацыяналізацыя жаночай працы ў значнай мэры залежыць ад умоў быту ў калгасах. Таму гаспадарчае разьвіцьцё калгасаў павінна неразрыўна ісьці з перабудовай быту на калектыўных пачатках.

Пасьпяховае вырашэньне бытавых пытаньняў залежыць ня толькі ад работы савецкіх і гаспадарчых органаў, але-ж, галоўным чынам, ад таго, наколькі будзе прыцягнута грамадзкая ініцыятыва і сродкі саміх калгасьнікаў.

На сёнешні дзень мы маем зусім нязначны лік жанчын на кіраўочай рабоце ў калгасах.

Між тым роля жанчын у гаспадарчым жыцьці калгасаў патрабуе і актыўнага ўдзелу калгасьніц у першую чаргу актывістак **у кіруючых органах калгасаў.**

Усе гэтыя задачы патрабуюць рашучага пералому ў парт. кіраўніцтве працай сярод жанчын, пераняцьня цэнтру работы ў калгас, каб праз арганізацыю актыву калгасьніц ня толькі арганізоўваць сталую масавую работу ўнутры калгасу, але-ж і накіроўваць асноўную масу сялянак на справу калектывізацыі.

Зразумела, пасылка камуністак на паўтара месяца ня вырашае ўсёй праблемы перабудовы работы сярод калгасьніц і сялянак у новых умовах калгаснага будаўніцтва.

Тэрмін кароткі — таму цэнтр цяжасьці работы мабілізаваных павінен быць перанесены на вырашэньне наступнага пытаньня — выяўленьне і арганізацыю сталай работы з актывам калгасьніц, ажыўленьне работы далегасных сходаў у вёсцы і арганізацыі іх у тых калгасах, дзе яшчэ іх няма, пад кутом выкананьня імі такіх задач:

Арганізацыя сацспаборніцтва паміж калгасьніцамі і актывам бяднячак і сераднячак на вёсцы па ўцягненьні батрачак і бяднацка-серадняцкіх мас сялянак у калгасы да моманту пасеўкампаніі.

100-процантная ліквідацыя няпісьменнасьці ў калгасах.

БУРАВА.

Працэс 825-ці ў Японіі

На працягу апошніх паўтара год сучасныя кіраўнікі Японіі прымалі самыя тэрміновыя меры да выкараненьня «небясьпечных думак», якія пагражае сьмерцю ўсякаму, хто зробіць замах на існуючы лад. І заспакоеныя грамадзяне не разумелі, для каго-ж прызначаны гэтыя лютыя законы, калі на японскіх выспах «усё спакойна». Незразуменьне гэта высьвятлілася толькі нядаўна, у пачатку лістапада, калі японскія газэты застракацелі сэнсацыйнымі паведамленьнямі аб «камуністычных змовах».

Выявілася, што яшчэ 15-га сакавіка 1928 г. **пракацілася па ўсёй Японіі хваля арыштаў асоб, западозраных ў камунізьме.** Арышты гэтыя былі выкліканы, галоўным чынам, масавымі выступленьнямі камуністых у час прадвыбарчае кампаніі ў лютым таго-ж году. 15-га красавіка 1929 году **зноў былі зроблены масавыя арышты камуністых.** Але першапачаткова ўрад катэгарычна забараніў газэтам пісаць што-небудзь па гэтай справе. Толькі 5-га лістапада гэта забарона была зьнята і газэты застракацелі спозьненымі навінамі.

У выніку энэргічнае дзейнасьці дэпартаменту паліцыі ў працягу паўтара год арыштавана ўсё актыўнае ядро японскае камуністычнае партыі. Лік арыштаваных і адданых цяпер пад суд дасягае 825 чалавек. За ўсю гісторыю Японіі гэта першы працэс з такім вялікім лікам абвінавачаных. Сьледзтва па справе арыштаваных вядзецца, акрамя Токіё, яшчэ ў 25 губэрскіх судох (ва ўсёй Японіі губэрскіх судоў 47).

У паведамленьні міністэрства юстыцыі гаворыцца, што з красавіка па тэрвень г.г была створана падпольная камуністычная арганізацыя, якая выпускала часопісь: «Чырвоны Сьцяг» і іншыя нелегальныя выданьні. Партыя высунула лёзунг аб зьмене дзяржаўнага ладу, аб разгоне парляманту і адмене самакіраўніцтваў. У ліку арыштаваных 586 рабочых, сялян і служачых, 130 студэнтаў розных навучальных устаноў, адзін афіцэр, рэштка — журналісты. У ліку арыштаваных знаходзяцца выдатныя правадыры левага крыла японскага рэвалюцыйнага руху: Фукумото Кадзуо, Іцікава Сьоіці, Сано Гаку, Мітамура і Набеяма.

Такім чынам, наступленьне на рэвалюцыйны рух краю ідзе разгорнутым фронтам. У апошні час барацьба паміж рабочымі і ўрадам, якая ня спынялася ні на адну мінуту, моцна абвастрылася. **Гэта абвастрэньне выклікана рэзка пагоршаным становішчам рабочае клясы ў выніку капіталістычнае рацыяналізацыі і надыходзячага крызісу.** Каждые даных міністэрства ўнутраных спраў, за пэрыяд студзень-верасень бягучага году зарэгістравана **1.009 працоўных канфліктаў,** якія ахапілі 119.278 удзельнікаў супроць 655 канфліктаў з 66.064 удзельнікамі за той-жа пэрыяд 1928 г. **Лік беспрацоўных бязупынна расьце.** Паводле афіцыйных даных, ва ўсіх буйных гарадох Японіі налічваецца **286.800 чалавек беспрацоўных,** амаль у два разы больш, чым у 1925 г.

Урад, каб забясьпечыць буржуазіі бесьперашкоднае правядзеньне рацыяналізацыі, кінуўся на перадавы атрад рабочага руху — на кампартыю — і ў лютым [illegible] японская рэакцыя зьбі[illegible]

ПА САВЕЦКІМ САЮЗЕ

НОВАРАСІЙСК. ЦЭМЭНТНЫ ЗАВОД «ПРАЛЕТАРЫ»



Абсталяваньне заводу найноўшымі печамі Грубэра дае магчымасьць павялічыць выпрацоўку цэмэнту на 30 проц.

Выкрыты багатыя месцанараджэньні фасфарытаў

Старшыня праўленьня трэсту «Фасфарыт» тав. Аляксеяў паведаміў нашаму супрацоўніку, што ў раёне Вольска (Н.-Волская вобласьць) выкрыты месцанараджэньні магутных і высокасортных фасфарытаў.

Запасы фасфарытаў вызначаюцца тут мільярдамі тон і па сваёй магутнасьці і якасьці падобны да вядомых мараканскіх фасфарытаў, якія імпартуюцца эўрапэйскімі краямі.

Паводле загаду старшыні ВСНГ РСФСР т. Лобава створана спэцыяльная камісія пад старшынством члена прэзыдыума т. Караташэўскага, якой запрапанавана неадкладна выехаць у Саратаў для вывучэньня пытаньня аб пробнай экспляатацыі месцанараджэньня. Разам з камісіяй НТУ ВСНГ і прафэсарамі Саратаўскага унівэрсытэту, якія ўжо на месцы працуюць, камісія ВСНГ прыступіць да правядзеньня дэталёвых разьведак і далейшага вывучэньня месцанараджэньня.

Калі арыентовачна вызначаемыя разьмеры фасфарытнага месцанараджэньня ў Вольску пацьвердзяцца, дык перад СССР адкрываюцца выключна багатыя пэрспэктывы.

АМАЛЬ 700 ТЫСЯЧ ГЭКТАРАЎ ПАХАЦІ АГРАМАДЖАНА

Паводле апошніх даных абласнога Калгасасаюзу, да 15-га сьнежня ў Маскоўскай вобласьці было агрэмаджана каля 685 тысяч гэктараў пахаці. Больш за ўсё аграмаджана пахаці ў Разанскай акрузе—268 тыс. гэкт.

Хібінскія апатыты

СЬВІДРАВАЛЬНЫЯ РАБОТЫ. — ПЕРШЫЯ ПЯЦЬ ВАГОНАЎ АПАТЫТАЎ

ЛЕНІНГРАД. Сьвідравальныя прабоі ны на апатытавых месцанараджэньнях на Кольскай паўвысьпе пройдзены на глыбіню звыш 200 мэтраў. Алмазныя сьвідры праходзяць праз багатыя апатытавыя пласты, якія зьмяшчаюць да 80 проц. чыстага апатыту.

У Ленінград дастаўлена ўжо 5 вагонаў хібінскіх апатытаў.

У САЎГАСЕ «ГІГАНТ»

У саўгасе «Гігант» скончаны будаўнічы сезон. Плян выканан на 122 проц. Пабудаваны будынкі для 4.200 рабочых, рамонтная майстэрня, сьвірны і гаражы на 400 трактараў і 100 аўтамабіляў. Скончана пабудова вялізарнага хлява, дзе будзе знаходзіцца да 5 тыс. розных с.-г. машын.

Праведзены водаправод. Пасёлак электрыфікаваны.

НОВАЯ ЧЫГУНКА

Паміж Саратавам і станцыяй Мілерава будзе пракладзена новая чыгунка. Яна будзе злучаць Паўночны Каўказ з Волскай водная сыстэмай.

На работах будзе занята да 10.000 рабочых. Агульны кошт чыгункі Саратаў-Мілерава — 100 мільёнаў рублёў.

НАФТАВЫ ФАНТАН

З Грозанага паведамляюць, што на Майкопскіх промыслах Грознафты забіў новы фантан. Штодзённа ён дае звыш 115 тон нафты. Тры новыя фантаны далі 14 тыс. тон нафты звыш плану за лістапад.

САВЕЦКІЯ ВАРШТАТЫ

З наступнае вясны пачнецца пабудова трох варштатабудаўнічых заводаў. Яны будуць выпускаць рэвальвэрныя, сьвідравальныя і фрэзэрныя варштаты і паўаўтаматы.

Адзін з такіх заводаў будзе пабудаваны ў Маскве. Штогодняя прадукцыя яго — 1.200 рэвальвэрных варштатаў. У Харкаве пачнецца пабудова заводу сьвідравальных варштатаў. Магутнасьць харкаўскага заводу — 1.800 варштатаў у год. Трэці магутны завод у Ніжнем Ноўгарадзе будзе выпускаць фрэзэрныя варштаты.

ТУКАВЫ КАМБІНАТ

Каля ст. Магнітная, дзе будуецца мэталюргічны завод, пачнецца пабудова тукавага камбінату. Прадукцыя тукавага камбінату цалкам прызначаецца для Сярэдняй Азіі. Туды штогодна будзе накіроўвацца 178 тыс. тон угнаеньняў.

Гэта павысіць ураджайнасьць бавоўны на 137 тыс. тон.

Павышэньне ўраджайнасьці бавоўны акупіць выдаткі на будаўніцтве камбіната ў працягу двух год, агульны кошт [illegible] камбінату — 50 мі[illegible] руб.

1.800 мільёнаў руб. на арганізацыю мясасаўгасаў

У канцы пяцігодкі мясасаўгасы будуць мець плошчу, роўную 2/3 Нямеччыны і ня менш 8 мільён. галоў жывёлы

МАСКВА, 31. Старшыня акцыйнага таварыства «Скотовод» т. Лацыс у гутарцы з супрацоўнікам ТАСС ахарактарызаваў работу, якую павінна разгарнуць таварыства. У 1929-30 годзе ў мяса-саўгасах таварыства будзе 1.100 тысяч галоў жывёлы, а да канца пяцігодкі—ня менш 8 мільёнаў галоў. Да канца пяцігодкі мяса-саўгасы таварыства будуць мець плошчу роўную 2/3 Нямеччыны—30 млн. гэкт. Зямля («Скотоводу») адводзіцца, галоўным чынам, у Казакстане (13 млн. гэкт.), Сібіры (6 млн. гэкт.), на Урале (2 млн. гэкт.) і ў іншых раёнах Саюзу. Сярэдні разьмер плошчы мяса-саўгасу—170 тыс. гэкт. Для паляпшэньня пароды сялянскае жывёлы таварыства прывязе з-за граніцы 5.000 галоў, быкоў на племя, а ў наступным годзе—25.000 быкоў. Радам эканамічных і заатэхнічных мерапрыемстваў «Скотовод» дапаможа калек тывізацыі сялянскіх жывёлагадоўчых гаспадарак. Кожны мяса-саўгас будуецца з такім разьлікам, што наўкола яго будзе створана кола жывёлагадоўчых калгасаў.

Для выкананьня ўсіх гэтых задач таварыству «Скотовод» асыгнавана ў гэтым годзе 147 млн. руб., а ў працягу пяцігодкі будзе дана 1.800 мільёнаў рублёў.

АРГАНІЗУЕЦЦА БУЙНЫ КАЛГАС ПАД СЯРПУХОВАМ

У 39 паселішчах каля Сярпухова ў сучасны момант калектывізавана ўжо каля 45% сялянскіх гаспадарак. Сярпухоўскі акрэкалгасаюз мяркуе з гэтых 39 паселішч арганізаваць калгас - камбінат, які зойме каля 14 тыс. гэкт. і будзе мець агародна - малочны напрамак. Калгас будзе даваць 10 тыс. тон малака і 310 тон мяса. Мяркуецца, што праз год гэты калгас-камбінат дасьць валавое прадукцыі на 5.500 тыс. руб.

АРГАНІЗАЦЫЯ КАЛГАСУ - ГІГАНТУ

СЬВЯРДЛОЎСК, 29. У Вярдзіцкай акрузе арганізаваўся другі калгас-гігант «Чырвоны Пуцілавец». У калгас увайшло 1.700 гаспадарак, — 9 сельсаветаў, на плошчы 80.000 гэкт. пахаці. Па сваёй вялічыні «Чырвоны Пуцілавец» будзе другім пасьля калгасу «Гігант» [illegible]

Таварыскія суды на фабрыках і заводах

МАСКВА, 30. Прэзыдыум ЦВК РСФСР прыняў закон аб таварыскіх судох на фабрыках, заводах, пры дзяржаўных і грамадзкіх установах. Старшыня і члены таварыскага суду выбіраюцца на агульным сходзе рабочых і служачых, або на агульна-заводзкіх канфэрэнцыях тэрмінам на 5 месяцаў. Таварыскія суды будуць разглядаць справы аб зьяўважальных словамі, на пісьме, або ўчынкам, справы аб пашырэньні хлусьлівых вестак, аб пакражах і грамадзянскіх позвах на суму да 25 руб. і, урэшце, розныя драбныя справы, якія адлюстроўваюць адмоўныя бакі быту, выпадкі свавольства, п'янства, парушэньні правіл у інтэрнатах і г. д.

Таварыскія суды могуць разглядаць такія справы і ў тым выпадку, калі бакамі зьяўляюцца рабочыя і служачыя аднаго прадпрыемства і ўстановы. Справы ў таварыскім судзе могуць узьнімацца, як па скарзе самога пацярпеўшага, так і па заяве групы рабочых і служачых. Усякая справа ў таварыскім судзе павінна быць скончана не пазней чым праз 7 дзён. Пасяджэньне суду павінна адбывацца публічна і ў нерабочы час. Гэтымі судамі могуць ужывацца меры ўзьдзеяньчаньня, пачынаючы з таварыскага папярэджаньня і канчаючы штрафам ня звыш 10 руб. у карысьць якой-небудзь грамадзкай арнізацыі. Пракуратура можа прыпыніць рашэньне таварыскага суду.



Завод «Чырвоны Прафінтэрн» у Бранску выпускае малаты сыстэмы «Бёме», якія атрымалі масавае пашырэньне, дзякуючы сваёй якасьці і ўстойлівасьці.

Нафта на Паўночным Урале

ЛЕНІНГРАД. Гэалёга - разьведвальная партыя выкрыла на Паўночным Урале наяўнасьць нафтавых месцанараджэньняў. Напрыклад, у раёне ракі Малое Кожвы выкрыты бясспрачныя аданакі нафтаносьнасьці на вялікай плошч

Партыйнае будаўніцтва

Узмоцнім парткіраўніцтва

работай камсамольскіх арганізацый

Пленум Цэнтральнага Камітэту КП(б)Б, які адкрываецца гэтымі днямі, абмяркуе адно з важнейшых палітычных пытаньняў — пытаньне парткіраўніцтва камсамолам і работы ЛКСМБ.

Відавочна, тая вялізарнейшая роля ленінскага камсамолу, якую ён адыгрывае ў нашым сацыялістычным будаўніцтве. Шырока разгортваючы крытыку і самакрытыку, мабілізуючы масы рабоча-сялянскай моладзі наўкола асноўных задач нашай партыі, прымаючы пад кіраўніцтвам кампартыі практычны ўдзел у будаўніцтве сацыялізму, бязьлітасна змагаючыся з правымі капітулянтамі і «левымі загібамі» трацкісцкага тыпу, з усялякімі хістаньнямі і ўхіламі ад лініі партыі, — камсамол зьяўляецца баявым памочнікам партыі ў барацьбе за генэральную лінію УсеКП(б). Вось чаму пытаньне камсамольскай работы, практычнае выкананьне задач партыйнага кіраўніцтва камсамолам зьяўляецца адным з адказьнейшых палітычных вучасткаў работы партыйных арганізацый.

Бязумоўна, парткіраўніцтва камсамолу ў асноўным правільнае, моцнае, кіраўніцтва, якое забясьпечвае выразнае правядзеньне ленінскім камсамолам генэральнае лініі партыі. Аб гэтым выразна сьведчыць тая непрымірымая барацьба камсамолу, якую ён пад кіраўніцтвам камуністычнае партыі праводзіць з усялякімі ўхіламі і хістаньнямі ад генэральнае лініі УсеКП(б). Стаўка трацкістых на моладзь, іх спроба супрацьпаставіць камсамол партыі папярэдла поўнае фіяска. Спроба ўхілістых распаўсюдзіць у радох камсамолу свае апартуністычныя панікёрскія ідэйкі таксама своечасова сустрэла жорсткі адпор з боку асноўнай масы камсамольскіх арганізацый. Усё гэта яшчэ і яшчэ раз падкрэсьлівае клясавую баяздольнасьць камсамолу ў яго барацьбе за лінію партыі, яго поўную адданасьць справе будаўніцтва сацыялізму.

Але на асобных вучастках камсамольскай работы не заўсёды выразна праводзіцца лінія партыі, асобныя зьвяньні камсамолу не заўсёды бываюць здольны выконваць асноўныя задачы партыі па сацыялістычным будаўніцтве. І гэта асабліва заўважаецца там, дзе парткіраўніцтва камсамолу яшчэ ня ўзьнята на прынцыповую вышыню, дзе асобныя арганізацыі фармальна адносяцца да кіраўніцтва камсамольскай работай. Там больш за ўсё маюць месца памылкі і недахопы ў практычнай рабоце некаторых камсамольскіх арганізацый.

Адсюль вынікае задача няўхільна ўзмацняць партыйнае кіраўніцтва камсамолу па ўсіх партыйных арганізацыях і ячэйках.

Гэта перш за ўсё павінна ісьці за рахунак пасьлядоўнага павялічэньня партыйнага ядра ў камсамоле. Трэба пастаянна і сыстэматычна падрыхтоўваць і перадаваць перадавых камсамольцаў, рабочых ад варштатаў, батракоў і с.-г. рабочых у рады партыі.

Толькі жорстка змагаючыся з фармальнымі казённымі адносінамі асобных парторганаў і арганізацый да кіраўніцтва камсамольскай работай, толькі няўхільна разгортваючы самакрытыку ў камсамоле, мы зможам яшчэ больш узмацніць рады ленінскага камсамолу для будучых рашаючых баёў за перамогу сацыялізму.

Г.

Бяз сыстэмы—ад выпадку да выпадку

На чарговым пленуме ЦК КП(б)Б стаіць пытаньне аб партыйным кіраўніцтве камсамолам. Зусім зразумела, чаму завастраецца ўвага партыйных арганізацый на стане партыйнага кіраўніцтва камсамольскімі ячэйкамі. Пытаньні правільнай выразнай работы камсамолу набываюць асаблівае значэньне.

Як абстаіць справа з парткіраўніцтвам у радзе ячэек Менску? Зусім бяспрэчна, што ў парт'ячэйках у гэтай рабоце, у параўнаньні з мінулым, ёсьць пералом. Партыйныя ячэйкі ў асноўным прымаюць удзел у штодзённай рабоце камсамольскіх ячэек і кіруюць імі.

Але не ва ўсіх ячэйках гэта мае месца. Адсутнасьць правільнага сыстэматычнага парткіраўніцтва ў некаторых ячэйках нярэдка прыводзіць да таго, што камсамольская ячэйка зусім бязьдзейнічае. Прыкладам у гэтым напрамку можа служыць ячэйка БДВ. Тут парт'ячэйка рацей слаба кіравала камсамольскай ячэйкай і ў выніку Фрунзаўскі райком ЛКСМБ распусьціў бюро ячэйкі. У апошні час парткіраўніцтва камсамольскай ячэйкай значна палепшылася.

Дрэнна скарыстоўваецца парт'ядро ў камсамольскай ячэйцы на швэйнай фабрыцы «Кастрычнік» (Менск). Камсамольская ячэйка налічвае 225 чалавек, с іх партыйцаў—20 чалав. Здаецца, маючы такі маленькі процант партыйцаў-камсамольцаў, трэ' было-б, каб усе камсамольцы-партыйцы прымалі актыўны ўдзел у рабоце камсамольскага калектыву. А між тым у камсамольскім калектыве актыўна працуе **толькі 10 партыйцаў.** Усяго камсамольскім калектывам за год перадана ў партыю 7 камсамольцаў. Партрымацаваныя да цэхавых ячэек ЛКСМ працуюць дрэнна. Большасьць партыйцаў-камсамольцаў працуе на іншай грамадзкай рабоце, а сакратарамі цэхавых камсамольскіх ячэек—амаль усе непартыйцы. Нават сакратар камсамольскага калектыву непартыец.

На некаторых фабрыках справаздача аб рабоце камсамольскіх ячэек, аб выкананьні дырэктыў партыі, заслухоўваецца на бюро парт'ячэек толькі пры перавыборах бюро камсамольскіх ячэек (напрыклад, на шчотачнай фабрыцы). У якасьці партрымацаваных вылучаюць перагружаных таварышоў. На тэй-жа шчотачнай фабрыцы, напрыклад, партрымацаваным вылучылі дырэктара фабрыкі. Ён з-за адсутнасьці часу, пасяджэньняў і сходаў камсамольскага калектыву не наведвае. І калі сакратар калектыву не наведвае. І калі сакратар калектыву ЛКСМ зварачаецца да таварыша з якім-небудзь пытаньнем камсамольскага характару, ён звычайна адказвае: «у мяне зараз часу няма».

Такое-ж становішча мы маем і на фабрыцы **«Чырвоны Тэкстыльшчык».** Партрымацаваным вылучылі старшыню акруговага саюзу тэкстыльшчыкаў, які з-за перагрузкі зусім ня цікавіцца камсамольскай работай.

На перавыбарчым сходзе камсамольскага калектыву гэтага прадпрыемства ні партрымацаванага, ні прадстаўніка ад партыйнай ячэйкі ня было. Тут ёсьць і такія выпадкі: бюро камсамольскай ячэйкі вылучае аднаго партыйца-камсамольца важатым піянэр-атраду, а бюро парт'ячэйкі зьнімае з яго гэту нагрузку і вылучае яго рэдактарам насьценгазэты. Парт'ячэйка ня цікавіцца піянэр-работай, лічачы, што гэта толькі камсамольская работа. Такім чынам, на шчотачнай і тэкстыльнай фабрыках мы бачым амаль адсутнасьць сыстэматычнага парткіраўніцтва камсамолам. Лепш з парткіраўніцтвам у ячэйцы наборнага цэху **друкарні БДВ.** Дзякуючы гэтаму, камсамольская ячэйка мае вялікі аўтарытэт сярод рабочых. Па ініцыятыве камсамольскай ячэйкі была арганізавана ўдарная брыгада. Брыгада в кожным дні́м пашыраецца за лік беспартыйных рабочых.

На нашы фабрыкі і заводы кожны дзень ўліваюцца новыя пласты моладзі. На некаторых заводах маладняк складае большасьць рабочых, работа сярод іх зьяўляецца ў даны момант адным з галоўнейшых задач партыйных і камсамольскіх арганізацый. Партыйныя ячэйкі павінны ў штодзённай рабоце стала і сыстэматычна кіраваць і дапамагаць камсамолу.

РУБІН.

Дабіцца пералому

На буйнейшых прадпрыемствах Нова-Варысава, фабрыцы **«Чырвоная Бярэзіна»** і гуце імя **Домбаля** партыйнае кіраўніцтва арганізацыямі ЛКСМБ знаходзіцца не на патрэбнай вышыні.

170 камсамольцаў «Чырвонай Бярэзіны» ў сваёй штодзённай рабоце не адчуваюць партыйнага кіраўніцтва. Партыйны калектыў і цэхавыя ячэйкі КП(б)В не зварачаюць амаль ніякай увагі на кіраўніцтва камсамольскай арганізацыяй.

Цэхавыя парт'ячэйкі, а іх на фабрыцы 9, нават у сваіх плянах работы ня маюць ні аднаго пункту па пытаньні аб кіраўніцтве камсамолам. Кіраўніцтва заключаецца толькі ў фармальным прымацаваньні часткі членаў партыі да ячэек ЛКСМБ. Да гэтага прымацаваньня партбюро амаль зазвычай падыходзіць павярхоўна, ня ўлічваючы актыўнасьці і працаздольнасьці данага члена партыі. І таму ня дзіва, што падбор кандыдатур бывае часамі вельмі няўдалы. Так, цэхавая ўпаковачнага цэху друкаваны для кіраўніцтва камсамолам вылучыла маладога партыйца, які зусім кідаўна ўступіў у кандыдаты партыі. Зразумела, што гэты партрымацаваны нічога ня даў камсамольскай ячэйцы.

Наогул прымацаваныя да камсамольскіх ячэек не праводзяць ніякай работы і ніяк ня кіруюць камсамолам у яго практычнай рабоце. Цэхавыя ячэйкі КП(б)В фабрыкі «Чырвоная Бярэзіна» не абмяркоўваюць сыстэматычна пытаньні работы фабрычнай арганізацыі ЛКСМБ. Толькі адна ячэйка ўпаковачнага цэху сёе-тое зрабіла ў гэтым напрамку.

Адзін сакратар цэхавай ячэйкі ЛКСМБ настойліва некалькі раз зьвяртаўся да сакратара партыйнай ячэйкі з просьбай абмеркаваць на партсходзе пытаньне аб становішчы камсамольскай ячэйкі. Ня гледзячы на тое, што гэтае пытаньне мела актуальнае значэньне, просьба сакратара камсамольскай ячэйкі ня прынесла ніякіх вынікаў. Толькі тады, калі бюро парткалектыву рубам паставіла пытаньне, сакратар парт'ячэйкі сяк-так выканаў просьбу. Даклад быў заслуханы на партыйнай ячэйцы, але ўсё гэта была праведзена фармальна, казённа і па сутнасьці не дало ніякай карысьці.

Ня лепш абстаіць справа і з агульным парткіраўніцтвам з боку бюро фабрычнага калектыву КП(б)В. Бюро калектыву прымацавала да фабрычных арганізацый ЛКСМБ дырэктара фабрыкі. Зразумела, што гэты таварыш вельмі загружаны і фактычна ня мае ніякай магчымасьці прымаць удзел у практычнай рабоце партыйнага калектыву.

Зьяўляючыся на сутнасьці «ганаровым» партрымацаваным (дырэктар), ён прысутнічае на пасяджэньнях бюро калектыву ЛКСМБ ня больш аднаго разу ў некалькі месяцаў. Бюро парткалектыву ня ўлічыла, што дырэктар, зьяўляючыся кіраўніком дзьвёх буйнейшых фабрык і электрастанцыі і начальнікам буйнога будаўніцтва, ні ў якім разе ня меў магчымасьці практычна выконваць свае абавязкі, як партрымацаваны. Гэта лішні раз падкрэсьлівае і характарызуе, наколькі бюро калектыву няўважліва падыходзіць да падбору кандыдатур.

Трэба адзначыць, што за апошні час заўважаецца некаторы зрух у гэтым напрамку. Бюро партыйнага калектыву прыступіла да вывучэньня работы фабрычна-камсамольскай арганізацыі.

Бюро калектыву вылучыла камісію па аглядзе арганізацыі ЛКСМБ фабрыкі. Пералом ёсьць, але ён яшчэ зусім няпрыкметны, яшчэ і да гэтага часу партарганізацыя фабрыкі не ўзьняла кіраўніцтва камсамолам на патрэбную прынцыповую вышыню.

Такія-ж недахопы ў кіраўніцтве камсамолам маюць месца і ў другім буйнейшым вытворчым калектыве КП(б)В гуты імя Домбаля. Партрымацаваныя амаль зусім не праводзяць ніякай работы. У практыцы цэхавых ячэек КП(б)В пытаньні камсамольскай работы і кіраўніцтва камсамолам не атрымалі амаль ніякага адлюстраваньня. Таму партыйная праслойка заводзкай арганізацыі КП(б)В зусім ніякамная. На 170 камсамольцаў налічваецца ўсяго 18 членаў і кандыдатаў партыі. Толькі ў самы апошні час рэкамэндавана ў партыю яшчэ 15 чалавек.

Узорам добрага кіраўніцтва камсамолам можа служыць работа чацьвертай цэхавай ячэйкі КП(б)В гуты імя Домбаля. З усіх парт'ячэек заводзкай арганізацыі, толькі гэта ячэйка сур'ёзна, пасапраўднаму ўзялася за ўзмацненьне і кіраўніцтва камсамольскай ячэйкай. Вылучаныя партрымацаваныя прымаюць актыўны ўдзел у практычнай рабоце ЛКСМБ. Здаецца, што бюро парткалектыву павінна было ўлічыць практыку чацьвертай ячэйкі і дабіцца такога стану работы ва ўсіх цэхавых ячэйках. Але на справе бюро парткалектыву, па прыкладзе партыйнага кіраўніцтва арганізацыі КП(б)В фабрыкі «Чырвоная Бярэзіна», не зварачае на гэта патрэбнай увагі. **Тут таксама бюро партыйнага калектыву прымацавала да заводзкай арганізацыі ЛКСМБ дырэктара.** Дырэктар таксама, выконваючы адказьнейшую гаспадарчую работу, зусім ня можа прымаць удзел у рабоце камсамольскай арганізацыі. Ясна, што вышэйпаданыя факты фармальных адносін да задач партыйнага кіраўніцтва камсамолам з боку бюро парткалектыву «Чырвонай Бярэзіны» і гуты імя Домбаля павінны быць зьвінчаны. Партарганізацыі пазіны паставіць перад сабой задачу па справе штодзённа і сыстэматычна, не ператвараючы кіраўніцтва ў дробязны кантроль, кіраваць камсамольскімі арганізацыямі.

Ф. О.

Пленум Бабруйскага АК КП(б)Б

Учора адкрыўся пленум акруговага камітэту партыі разам з партактывам. З дакладам аб пастановах ЦК КП(б)Б па дакладу Бабруйскай арганізацыі выступіў т. **Гантман.**

Па дакладу разгарнуліся жвавыя спрэчкі, якія заняли два пасяджэньні. Выступілі 25 таварышоў.

У прынятай рэзалюцыі пленум цалкам ухваліў пастановы ЦК і лічыць, што гэтыя пастановы поўнасьцю адпавядаюць фактычнаму стану партарганізацыі.

Пленум абавязвае бюро акругкому і ўсе арганізацыі акругі палажыць рэзалюцыю ЦК у аснову далейшае працы.

Пленум пастанавіў распрацаваць на сходах пастановы ЦК ва ўсіх ячэйках, на сходах рабочых і батракоў.

„Налёт" на „налётчыкаў"

Сэктар друку АПА ЦК КП(б)Б разам з ЦКК КП(б)Б і Фрунзенскім райкомам партыі арганізаваў „налёт" на рэдакцыі цэнтральных газэт па пытаньні праверкі скарыстаньня рэдакцыямі рабселькораўскіх допісаў

Ніжэй зьмяшчаем артыкул, які абагульняе першапачатковыя вынікі „напёту"

«... Чамусьці ня чуваць у нас аб такіх выпадках, калі кіруючыя цэнтральныя органы друку крытыкавалі-б другія цэнтральныя органы, і амаль адсутнічае крытыка органаў мясцовага друку. Між тым, пры манапольным становішчы камуністычнага друку, адсутнічаньне самакрытыкі ў гэтай галіне надзвычайна шкодна, добра было-б па гэтай лініі зрабіць рад крокаў ня толькі ў цэнтры, але і ў абласьцях».

(З дакладу т. В. М. МОЛАТАВА на Ўсесаюзнай нарадзе рэдактароў)

Вальшавіцкі друк Беларусі мае за апошні год рад бясспрэчных дасягненьняў.

Надзвычайна высока вырасла дзейсная роля «Зьвязды», як баявога цэнтральнага органу партыі, рэзка ўзьнялися тыражы нашых масавых газэт («Беларуская Вёска»—мае 69 тысяч падпісчыкаў, «нованароджаная», існуючая ўсяго некалькі месяцаў піянэрская газэта мае 30 тысяч экзэмпляраў, «Чырвоная Зьмена»—17 тысяч экзэмпляраў і г. д.), палепшылася якасьць газэт «Акцябр» і «Орка», павялічылася сетка часопісяў.

Сыстэма нашага бальшавіцкага друку ўсім нутром, карэньнямі ўрасла ў справу непасрэднага ўдзелу ў сацыялістычным будаўніцтве, у справу згуртаваньня навакол партыі найшырэйшых мас працоўных.

І таму на фоне значных дасягненьняў нашага друку асобныя «недарэчнасьці мэханізму» асабліва выразна выпучаюцца, асабліва настойліва і рашуча патрабуюць свайго выпраўленьня, пры ўдзеле найшырэйшай масы працоўных—рабселькораў і чытачоў газэт.

Друкуючы сёньня першапачатковыя вынікі «налёту» (і 2-х нарад працаўнікоў друку разам з брыгадзірамі, што адбыліся ў зьвязку з гэтым пры сэктары друку), мы ўпэўнены, што працаўнікі друку, пры належным падтрыманьні рабселькораў і ўсёй пралетарскай грамадзкасьці, замацуюць сваёй далейшай работай заклік часопісу «Журналист» аб тым, што:

«...Мы жадаем, мы патрабуем, каб намаганьнямі лепшых элемэнтаў нашага журналісцкага асяродзішча былі створаны гэткія ўмовы ўзаемнага кантролю і кантролю друку з боку мас, пры якіх вялізарныя труднасьці задачы, ускладзеныя партыяй на друк, былі-б ёю з найбольшым посьпехам і гонарам выкананы».

«...Мы таму настойліва дабіваемся ад саміх працаўнікоў друку наладжаньня ўнутры друку, пры дапамозе мас, рэжыму бязьлітаснай, дзелавой, бальшавіцкай самакрытыкі».

***

...У залі пасяджэньняў ЦК адбывалася чарговая нарада камуністых—работнікаў цэнтральных газэт, а ў суседнім пакоі ўжо паўным-паўно «налётчыкаў». Брыгада з членаў райкому партыі і студэнтаў апошняга курсу камвузу—у баявым зборы.

Задача брыгады і простая і разам з гэтым нялёгкая: трэба праверыць якасьць, гнуткасьць работы генэральных «налётчыкаў»—рэдакцый нашых газэт, трэба правесьці «налёт налётаў»—«налет на налётчыкаў».

Стрыжнявая ўстаноўка «налёту»—раптоўна і разам з гэтым дасканала зрабіць агляд таго, як апарат рэдакцый выкарыстоўвае асноўную газэтную валюту, заплаты газэтны фонд—допісы рабочых і сельскіх карэспандэнтаў. — наколькі пасьпяхова рэдакцыі спраўляюцца з рассмоктваньнем на газэтных артэрыях тысяч допісаў.

...Шалясьцяць хутка раздаваемыя па руках «налётчыкаў» лісткі апэрацыйнага заданьня, выразна ідзе разьбіўка на групы і пасьля некалькіх скупых падарожных слоў (заданьне—зразумелае, а часу—мала) групы «Зьвяздоўцаў», «Чырвонаармеецаў»,«Рабочагазэтчыкаў», «Бел вясковцаў» і «Акцябраўцаў», разам з працаўнікамі газэт, ня гледзячы на позьні час, накіроўваюцца па рэдакцыях.

«Налёт на налётчыкаў» пачаўся

АБ ЗАЛЕЖАХ І ХАЛАСТЫХ СТРЭЛАХ

Залежы допісаў маюцца ва ўсіх рэдакцыях.

У меншай меры гэтыя залежы ў «Зьвязьдзе», значна больш у Рабочем», «Чырвонай Зьмене» і «Савецкай Беларусі», **але правафлянговым у адносінах залежу допісаў бясспрэчна можа быць названа рэдакцыя газэты «Беларуская Вёска».**

У рэдакцыю гэтай газэты паступае, у сярэднім, у дзень больш за 250 допісаў.

Брыгада, якая праводзіла праверку, адзначыла, што ва ўсіх сталых рэдакцыйных працаўнікоў, за выключэньнем стала рэдактара газэты (які вядзе антырэлігійны аддзел) беспарадак, садом і гаморра.

Брыгадзір, які знаёміўся з становішчам допісаў ў папках юрыдычнага аддзелу газэты «Беларуская Вёска», піша: «Мы ў юрыдычным аддзеле знайшлі звыш 100 допісаў. Парадку—ніякага, усё раскідана, нідзе толкам нічога ня знойдзеш».

Папкі аддзелаў падобны на Ноеў каўчэг—усе допісы зьмешаны у кучу.

Амаль палова допісаў, якія прысылаюцца разам з маркамі для адказу, ляжаць у рэдакцыі бяз руху.

Ёсьць допісы, прысланыя ня толькі з маркамі, але разам і з канвэртамі, паперай і загадзя запасьліва напісанымі адрасамі.

У папках юрыдычнага аддзелу брыгадзір, на выбарку, прачытаў 7 допісаў—запытаньняў, з якіх тры з шматлікімі калектыўнымі подпісамі і з маркамі для адказу, але... але гэтыя запытаньні так і засталіся без адказу. 50 допісаў, якія закранаюць пытаньні кулацкіх вылазак, паведамляюць аб контр-рэвалюцыйнай агітацыі, ня толькі ня зьмешчаны, але не абагулены і нават у рэдакцыі **не прачытаны.**

Недарма сярод прагледжанага матар'ялу сустракаліся допісы, у якіх селькоры пішуць, што вось яны насылаюць у газэту, мабыць, пяты ліст, кожны з маркамі, але, ня гледзячы на ўсю сваю настойлівасьць, не атрымліваюць ад рэдакцыі адказу.

І таму горкай і ня зусім дарэчнай іронпіяй гучелі словы прадстаўніка газэты «Беларуская Вёска», які на нарадзе па выніках «налёту», у адказ на вышэйпаданьня факты, паведаміў, што гэтыя факты не такія ўжо страшныя, што вось ёсьць выпадак, калі **«...селько піша, што ён паслаў нам ужо 40 допісаў і мы ніводнага не зьмясьцілі. Мы праверылі. Матар'ял селькора сапраўды каштоўны і ўсё-ж такі мы яго не скарыстаілі, бо яго недзе было ў газэце зьмясьціць».**

І на фоне гэтых слоў зусім да рэчы зьяўляецца заключэньне брыгады аб тым, што ў радзе нумароў газэты «Беларуская Вёска» ёсьць зусім недапушчальнае становішча, калі пераважная большасьць газэтнай плошчы прадастаўляецца выключна пад артыкулы сталых працаўнікоў газэты, у той час, як з атрыманых за 8 дзён (з 26-га лістапада па 3-е сьнежня) **1.283** допісаў у газэце скарыстаны ўсяго **42 *)** допісы. І нядзіва, гэтакім чынам, што селькор піша 40 допісаў і ні адзін з іх ня друкуецца.

1.283 і 42—гэтыя лічбы прымушаюць прызадумацца аб тэй значнай **размычцы** паміж **прыцёкам** карэспандэнцый і іх **скарыстаньнем, калі толькі за восем дзён—970 допісаў ідуць зусім не скарыстанымі ў архіў, застаюцца халастымі стрэламі.**

Не абавязкова, зразумела, каб газэта зьмяшчала на сваіх старонках увесь матар'ял, што яна атрымлівае.

Але абавязкова, каб газэта забясьпечыла поўнае, вычарпальнае **скарыстаньне** (у тэй ці іншай форме) хвалі карэспандэнцый каб была забясьпечана **дзейнасьць** допісаў—гэтай адной з рашаючых артэрый газэтнай крывяноснай сыстэмы.

І іменна ў гэтым—**у размычцы, у разрыве**—паміж узьнятай хваляй карэспандэнцый зьнізу і іх скарыстаньнем **зьверху,** у рэдакцыі і праз рэдакцыю — і пісьм.

хаваецца адна з буйных палітычных і практычных памылак газэты «Беларуская Вёска», памылка, якая **аб'ектыўна** спрыяе **затрыманьню разьвіцьця і дзейнасьці самакрытыкі,** памылка, якая **штучна** затрымлівае, каструе далейшы паўнакроўны рост рабселькораўскага руху.

Гэтая памылка — частковы вынік няўменьня рэдакцыі правільна разьмеркаваць свае сілы, калі **«на внешний фронт»**—на масавыя выезды — кідаюцца ўсе асноўныя сілы (за апошнія 1½ месяца было 145 дзён выездаў; у пачатку сьнежня выехала 6 працаўнікоў, з якіх кожны прабудзе ў паездцы на 40 дзён), а **«ўнутраны фронт»**—работа над допісамі—застаецца аголеным, поўбясьпрытульным (у рэдакцыйным аддзеле, з прычыны гэткай значнай колькасьці выездаў, фактычна працуе 2-3 чалавекі).

Выезды на месцы — патрэбнейшая рэч, але нельга рабіць выезды ў непасільнай колькасьці, нельга ператвараць умовы работы ў рэдакцыі ў сваявыглядны «трышкін кафтан»!

Мы няўмысьля так падрабязна спыніліся на недахопах з скарыстаньнем рабселькораўскіх допісаў у газэце «Беларуская Вёска», бо гэта газэта мае найбольш разгорнутую і густую рабсель кораўскую сетку ў Беларусі.

Мы лічым, што тут, на прыкладзе, найбольш распаўсюджанай у Беларусі газэты найбольш яскрава выявіўся **згустак** тых недахопаў, якія патрабуюць найбольш хуткага зьнішчэньня.

***

У газэце «Зьвязда» у сталых усіх аддзелаў «налётчыкі» выкрылі ўсяго каля 179 допісаў; у газэце «Савецкая Беларусь — каля 300 допісаў (патрэбна адзначыць, што за час з 24 лістапада па 3 сьнежня, за 9 дзён, газэта зьмясьціла 131 допіс); **у газэце «Рабочий»—911 допісаў** (частка допісаў ляжыць бяз руху па два месяцы, зараз-жа ў апошніх нумарох газэты, у сярэднім, зьмяшчаецца 30-40 допісаў); **у газэце «Чырвоная Зьмена»**—294 допісы+300 вершаў+170 розных запытаньняў (у сярэднім газэта атрымлівае ў дзень 90-120 допісаў. Хаваньне матар'ялаў ва ўсіх сэктарах, за выключэньнем саюзнага, ня зусім добрае. У кожным нумары газэты зьмяшчаецца 17-20 рабселькораўскіх допісаў); **у газэце «Акцябр»** рабселькораўскі матар'ял, за выключэньнем рабочага аддзелу, хаваецца ў **«паэтычным беспарадку»:** адна заява, надпісаная 200 рабочымі, ляжыць у рэдакцыі звыш году; сакрэтныя дакуманты знаходзяцца ў агульных папках; газэта, ня гледзячы на вялікі фармат, зьмяшчае ў кожным нумары ўсяго каля 14 рабселькораўскіх допісаў.

У ЧЫМ «ГВОЗД» ПЫТАНЬНЯ?

«Гвоздзь» пытаньня, зразумела, у сыстэме работы, ва ўменьні рацыянальна, дарэшты вычарпаць магчымасьці, якія, праўда, іншы раз у нас вельмі абмежаваныя (мала кваліфікаваных працаўнікоў, памяшканьні рэдакцый не забясьпечваюць нармальных умоў работы; «Беларуская Вёска», напрыклад, знаходзіцца ў памяшканьні, якое больш падобна на камеру для арыштаваных, чым на рэдакцыю газэты і г. д).

Некаторую **«скідку»** на такія ўмовы работы прыходзіцца рабіць, але разам з гэтым патрэбна з усёй настойлівасьцю і рэзкасьцю сказаць, **што магчымасьці ўсё-ж такі скарыстоўваюцца няпоўнасьцю.**

Нашы газэты не правяраі і не праяўляюць неабходнай напорыстасьці ў ажыцьцяўленьні спэцыяльнай пастановы прэзыдыуму ЦКК аб парадку скарыстаньня рабселькораўскіх допісаў.

У значнай частцы рэдакцый аб гэтай пастанове ЦКК—пастанове, якая побач з прынцыповым угрунтаваньнем пытаньня намячае рад дзелавых мерапрыемстваў, **забыліся, ня ведаюць.**

У частцы супрацоўнікаў нашых газэт мала праяўлялася **ПАЧУЦЬЦЯ АДКАЗНАСЬЦІ** за кожны рабселькораўскі допіс, за яго скарыстаньне.

У значнай частцы рэдакцый нашых газэт амаль адсутнічае з боку кіраўнікоў сталая, штодзённая праверка выкананьня працаўнікамі заданьняў у адносінах скарыстаньня рабселькораўскіх допісаў.

Гімалаі залежаў допісаў у «Беларускай Вёсцы», «Акцябры» і ў некаторых іншых газэтах—навочны гэтаму доказ!

І правільнымі зьяўляюцца **мерапрыемствы газэты «Зьвязда»,** якая яшчэ да нашага «налёту» самастойна практыкавала сіламі рабкораў і масавага аддзелу «налёты» ўнутры рэдакцыі газэты: сваячасова **мерапрыемства газэты «Рабочий»** дзе ўводзіцца ў сыстэму прымацаваньне да пэўных аддзелаў рабочых брыгад, якія-б праглядалі і дапамаглі, разам з усім рэдакцыйным калектывам, за тым, каб кожны допіс у тэй ці іншай меры быў скарыстаны, не застаўся без адказу.

Трэба ўмець аб'яднаць навакол рэдакцыі актыў, трэба апірацца ў практычнай рабоце на шырокую масу добраахвотнага, бясплатнага актыву.

У нас культурнае справа з вучотам допісаў і вучотам іх скарыстаньня. Тэхніка вучоту рэзка адстае ад тэмпу работы рабселькораў.

Трэба спадзявацца, што ўвядзеньне ў бліжэйшы час аднолькавае сыстэмы вучоту ва ўсіх рэдакцыях газэт (мэрапрыемствы прапрацоўваюцца ў ЦКК) дапаможа **арганізацыйна замацаваць** рашучае зьнішчэньне «бяспрытульнага» становішча рабселькораўскіх допісаў у асобных рэдакцыях і асобных аддзелах нашых газэт.

Патрэбна яшчэ больш рашуча разгарнуць з боку саміх працаўнікоў газэт жорсткую, дзелавую самакрытыку недахопаў у рабоце газэты, патрэбна рашуча асудзіць праўленьне сваявыгляднай масабоязьні і глыбока памылковага ўспрыняцьця кантролю і дапамогі з боку працоўных, якое мела месца ў часе «налёту», калі супрацоўнік аднэй з рэдакцый прабаваў... захаваць у рукаў ад вачэй брыгадзіра допіс, як меў з месячную даўнасьць.

ГРОБАКАПАЦЕЛІ САМАКРЫТЫКІ

«Налёт» з надзвычайнай выразнасьцю выявіў яшчэ адно слабое зьвяно ў сыстэме скарыстаньня рэдакцыямі атрымліваемых допісаў.

Дзесяткі, сотні допісаў ня друкуюцца, а пасылаюцца ў адналедныя ўстановы на рассьледваньне.

Але бяда ня ў тым, што допісы пасылаюцца на рассьледваньне, а бяда ў тым, што фактычна **амаль адсутнічае кантроль,** наколькі хутка і вычарпальна рассьледаваны той ці іншы допіс, наколькі рашуча ажыцьцяўлены па допісе неабходныя мерапрыемствы.

Вось факты.

На 750 запытаньняў газэта «Зьвязда» не атрымала ніякага адказу.

Па газэце «Савецкая Беларусь» за апошнія чатыры месяцы было паслана на рассьледваньне 1.200 допісаў, а адказы атрыманы толькі на 600 допісаў.

Ёсьць значная колькасьць допісаў, у якіх стаж іх марынаду «ў соусе» розных устаноў вылічваецца больш як паўгода.

Па газэце «Чырвоная Зьмена» з 400 допісаў, пасланых за апошні год на рассьледваньне, адказы атрыманы толькі на 23 процанты.

Адносна лепш абстаіць у гэтых адносінах справа ў газэце «Беларуская Вёска» (з 308 пасланых на рассьледваньне заметак — атрымана 269 адказаў), але і тут маем рад фактаў, калі нават пракуратура і РСІ па 1½-2 месяцы затрымліваюць адказы па допісах, пасланых да іх на рассьледваньне.

Красамоўны той факт, што адказ на адзін допіс «ехаў» з ЦП прафсаюзу хэмікаў да рэдакцыі газэты «Зьвязда» ня больш і ня менш, як два месяцы!

Вось, сапраўды клясычная, песьперасадачная «пляцкарта» бюракратызму і цяганіны!

Адзін з селькораў паведаміў рэдакцыю **газэты «Зьвязда»** аб тым, што ня даўна, зайшоўшы ў РВК (на жаль, дакладная назва РВК не паказана), ён выкрыў у папцы справавода калекцыю допісаў, прысланых на рассьледваньне усяго каля 40 штук, на лёс якіх ніхто ніякае ўвагі не зварочвае.

ЗА БАЯВОЕ, НАПОРЫСТАЕ І АЎТАРЫТЭТНАЕ БЮРО РАССЬЛЕДВАНЬНЯЎ!

Прыведзеныя факты гавораць аб тым, што гробакапацелі самакрытыкі ў апаратах нашых устаноў акапаліся яшчэ шмат, што супроць іх патрэбны моцна дзейныя сродкі, патрэбна ня толькі «лёгкая кавалерыя», але і «цяжкая артылерыя» ўсёй пралетарскай грамадзкасьці.

У першую чаргу **трэба перабудаваць работу бюро рассьледваньняў** пры рэдакцыях газэт.

Бюро рассьледваньняў зараз у большасьці сваёй зьяўляюцца штампоўшчыкамі, перадатачна - мэханічнай інстанцыяй.

Трэба ўдыхнуць жыцьцё ў работу бюро рассьледваньняў, трэба зрабіць іх баявымі, напорыстымі, аўтарытэтнымі, якія-б апіраліся ў сваёй рабоце на кадры актыву, на брыгады «таўкачоў».

У большай мере патрэбна скарыстоўваць супроць гробакапацелаў моц друкаванага слова.

Трэба друкаваць сьпісы ўстаноў і асоб, якія хаваюць у адносінах «запораў» па рассьледваньні заметак, бязьлітасна трэба выкрываць і бічаваць «канкрэтных носьбітаў зла».

***

Матар'ялы «налётаў» высоўваюць рад вострых, патрабуючых хуткага і дзелавога вырашэньня пытаньняў.

Мы сёньня ў парадку першапачатковага абагуленьня, закранулі толькі некаторыя з гэтых шматлікіх пытаньняў, якія ў хуткім часе, у поўным аб'ёме будуць прапрацаваны спэцыяльнай камісіяй АПАД ЦК КП(б)Б, абтаворанай з асяродзішчы газэтных працаўнікоў і рабселькораў, а потым пойдуць, як падстава, у якасьці матар'ялаў, для надыходзячага плянавага абсьледваньня работы рэдакцый газэт з боку ЦКК.

«Налёт» быў праведзены не таму, што мы не давяраем рэдакцыям газэт, а для таго, каб у часе работы рэдакцый убачыць хібы, якія сапраўды кідаюцца ў вочы, для таго, каб дапамагчы перамагчы руціну, якая часамі з-за нашай перагружанасьці, мае месца ў асобных працаўнікоў.

Як у кожнай вялікай і разгортванай справе, так і ў рабоце рэдакцый газэт у большай, або меншай ступені ёсьць асобныя недахопы, асобныя хібы, на якіх мы сёньня згуртоўваем увагу пралетарскай грамадзкасьці.

Трэба сумесьнымі сіламі гэтыя недахопы зьнішчыць.

Трэба яшчэ ў большай меры зрабіць нам друк дзейсным і верным зброяй Камуністычнае партыі ў справе сацыялістычнага будаўніцтва краіны.

А. КУРЦІК.

*) З гэтай колькасьці было паслана на рассьледваньне 308 допісаў і ў паштовай скрынцы быў зьмешчан адказ на 34 допісы.

Падрыхтоўка да сяўбы яшчэ ня вышла з габінэтаў акруговых устаноў

НЕДАПУШЧАЛЬНЫ ТЭМП АЧЫСТКІ НАСЕНЬНЯ

ПАСТАНОВА СНК НЕ ПАПУЛЯРЫЗАВАНА СЯРОД СЯЛЯНСТВА

Азнаёміўшыся са становішчам падрыхтоўкі да веснавой сяўбы, НКЗ БССР канстатуе, што праца ў гэтай галіне яшчэ не разгарнулася.

Падрыхтоўка пакуль што ўсё яшчэ **ня ідзе далей працы па плянаваньні ў акруговых установах.** Ня скончылі нават плянаваньне некаторыя цэнтральныя апараты, **як Паляводсаюз, Белсельтрэст.** Гэта стварае пагрозу спазьненьня з **давядзеньнем плянаў веснавой сельска-гаспадарчай кампаніі да асобнага калгасу — саўгасу і паселішча. Між тым, згодна пастановы СНК БССР 25-га студзеня зьяўляецца апошнім тэрмінам выкананьня гэтай працы.**

Тэмп загатовак насеньня Белпаляводсаюзам і Белкаапсаюзам стварае пагрозу зрыву пляну заг

Трывожныя сыгналы з прамысловага фронту

ДЫРЭКТЫВА АБ 11-ПРОЦ. ЗНІЖЭНЬНІ САБЕКОШТУ НЯ ВЫКОНВАЕЦЦА

У ПЕРШЫМ КВАРТАЛЕ ПРАФАРГАНІЗАЦЫІ ПРАЙШЛІ МІМА ВАЖНЕЙШЫХ ВЫТВОРЧЫХ ПЫТАНЬНЯЎ

АРГАНІЗУЕМ РАБОЧЫЯ БРЫГАДЫ ДЛЯ МАСАВАЙ ПРАВЕРКІ ВЫКАНАНЬНЯ ПРАМФІНПЛЯНАЎ

„Ганьба яшчэ можа быць змыта. Але яна можа быць змыта не сама сабой, не самацёкам, не „авось, да как-нибудь", а ўдарнай работай гаспадарнікаў разам з лепшымі рабочымі вытворчасьці".

У. КУЙБЫШАЎ.

ЯК ПРАМЫСЛОВАСЬЦЬ БССР ЗНІЖАЕ САБЕКОШТ

Новы апэрацыйны год прадугледжвае зьніжэньне сабекошту прадукцыі на 11 проц.

Як-жа спраўляецца з гэтай задачай прамысловасьць БССР? Як паведамлялася ўжо ў друку, першыя месяцы новага апэрацыйнага году характарызуюцца слабаватым тэмпам разгортваньня прамысловасьці. Гэта адбілася і на сабекошце.

Па гарбарнай і абутковай прамысловасьці мы пакуль што маем наступны малюнак: Гомельская гарбарня «Пралетарскі шлях» замест 5 проц. зьнізіла сабекошт на 1,2 проц.; **Віцебская абутковая фабрыка** зьнізіла сабекошт на 5 проц. супроць 11,7 проц. паводле пляну. Таксама дрэнна стаіць справа і з **Гомельскай абутковай фабрыкай «Праца»**, якая замест 20 проц. зьнізіла ўсяго сабекошт на 2,3 проц.

Слаба разгарнулася работа па зьніжэньні сабекошту і **па запалкавай прамысловасьці**, па якой мы маем наступныя вынікі:

Па фабрыцы «Дняпро» ў кастрычніку маем зьніжэньне сабекошту на 0,35 проц., замест 13,6 проц., прадугледжаных плянам, **па ф-цы «Х Кастрычнік»**—6,13 проц. супроць 14,2 проц. паводле пляну і **ф-цы «Вэзувій»**—4,2 проц., замест 10,6 проц.

Ня зусім здавальняючыя вынікі і па **харчовай прамысловасьці.** Так, па маслабойнай выторчасьці мы маем у кастрычніку зьніжэньне сабекошту супроць 1928-29 году на 1 проц. і **павялічэньне супроць праграмы на 4,6 проц.**, прычым асабліва дрэнна абстаіць справа з маслабойным **заводам імя Адзярыха**, які паказвае супроць 1928-29 г. **рост сабекошту на 5,3 проц.** Па дражджавых заводах хоць зьніжэньне сабекошту склала 12 проц., але супроць пляну, што прадугледжвае зьніжэньне на 18 проц., мы яшчэ маем прыкметнае адставаньне.

Нельга пахваліцца і вынікамі па **мэталёвай прамысловасьці**, якая, паводле папярэдніх даных, паказвае ў кастрычніку месяцы зьніжэньне сабекошту ўсяго на 6,3 проц., замест 14,7 проц. запраектаванага плянам. Найбольшае адхіленьне ад праграмных дырэктыў паказваюць заводы: «Чырвоны Мэталісты» (зьніжэньне на 6,5 проц., супроць 13,1 проц.), «Чырвоны Кастрычнік» (+0,3 проц., замест—6,9 проц.), **завод «Энэргія»** (+1,2 проц. супроць—16,8 проц., паводле пляну) і **завод «Пралетары»** (—6,2 проц. замест 16,6 проц., прадугледжаных плянам).

Параўнальна з плянавым заданьнем, мы маем ня зусім здавальняючыя вынікі і **па папяровай прамысловасьці**, якая дала ў кастрычніку зьніжэньне сабекошту на 7,5 проц., а ў лістападзе—ўжо толькі на 4 проц. У выніку за 2 месяцы папяровая прамысловасьць паказвае зьніжэньне сабекошту ўсяго на 5,8 проц. замест 12,2 проц., прадугледжаных плянам. За выключэньнем фабрыкі «Спартак», даўшай некаторае набліжэньне да заданьня прамфінпляну, іншыя фабрыкі паказваюць нязначныя вынікі, якія асабліва дрэнныя аказаліся па ф-цы «Гэрой Працы» (зьніжэньне за кастрычнік і лістапад на 4,56 проц., супроць 12,1 проц. паводле пляну) і ф-цы «імя Сталіна» (+16,5 проц. замест зьніжэньня на 14 проц.).

Швэйная прамысловасьць адзначыла ў кастрычніку месяцы зьніжэньне сабекошту на 7,3 проц., замест 10 проц. на пляне. Пры параўнальна станоўчых выніках па фабрыках «Кастрычнік» (Менск) і «Прафінтэрн» (Віцебск), паказаўшых адпаведна зьніжэньне на 8,4 і 6,8 проц., па іншых фабрыках маем нездавальняючыя вынікі. Так, Гомельская фабрыка замест зьніжэньня сабекошту на 9 проц., паказвае зьніжэньне на 5,7 проц., Магілеўская фабрыка дае зьніжэньне на 4,6 проц. супроць 10,6 проц. паводле пляну.

Параўнальна станоўчыя вынікі па зьніжэньні сабекошту адзначаюцца і па некаторых іншых прадпрыемствах. Так, гута **«Пралетары»** замест 7,56 проц. у кастрычніку лістападзе паказвае зьніжэньне на 6,15 проц. **Магілеўская гарбарня** адзначае зьніжэньне сабекошту на 9 проц., супроць 4 проц. па пляне, што напрашвае вывад аб правільнасьці запраектаванай лічбы. Здавальняючыя вынікі мы маем і па мэталёвым заводзе «Камунар», які ў кастрычніку паказвае зьніжэньне сабекошту на 23,9 проц., супроць 26 проц. паводле пляну.

ІНЭРТНАСЬЦЬ ГАСПАДАРНІКАЎ І ПРАФАРГАНІЗАЦЫЙ

Выходзячы з аналізу асобных паказальнікаў, якія характарызуюць работу прамысловасьці ў кастрычніку і лістападзе, можна адзначыць, што **дырэктыва аб зьніжэньні сабекошту знаходзіцца пад пагрозай невыкананьня.**

Трэба падкрэсьліць, што нездавальняючыя вынікі работы прамысловасьці нельга выключна адносьці за рахунак аб'ектыўных момантаў. У радзе выпадкаў прыходзіцца сустракацца з інэртнасьцю як гаспадарнікаў, так і прафесыянальных арганізацый.

Становішча, якое стварылася, дыктуе прыняцьце настойлівых і рашучых мер. Трэба безадкладна перад кожным прадпрыемствам, кожным рабочым пытаньне аб зьніжэньні сабекошту паставіць ва ўсю шырыню. Вакол зьніжэньня сабекошту трэба максымальна мабілізаваць думку нашай грамадзкасьці.

У першую чаргу трэба завастрыць увагу на наступных пытаньнях.

Трэба праявіць максымальна-плянавую дысцыпліну ў адносінах набору новай рабочай сілы, бо першыя месяцы сыгналізуюць, што на гэтым фронце ня ўсё добра.

Асаблівую ўвагу трэба зьвярнуць на павышэньне прадукцыйнасьці працы, забясьпечэньні гэтае адпаведнымі мерапрыемствамі ў адносінах паляпшэньня тэхнічна-нармовачнай работы, рацыяналізацыі вытворчасьці, узмацненьня працоўнай дысцыпліны, паляпшэньне скарыстаньня рабочай сілы і падрыхтоўкі новай рабочай сілы, а таксама і абавязковага выкананьня пляну на ахове працы і тэхнічнай забясьпецкі.

ВАЙНА НЕРАЦЫЯНАЛЬНАМУ ВЫКАРЫСТОЎВАНЬНЮ МАТАР'ЯЛАЎ І СЫРЦУ

Баявой задачай павінна стаць усямерная барацьба прамысловасьці са стратамі. Неабходна з усёй рашучасьцю абвясьціць вайну драпежнаму і нерацыянальнаму скарыстаньню рабсілы, сырцу, матар'ялаў, апалу і абсталяваньня.

У гэтых адносінах сацспаборніцтва і ў асаблівасьці ўдарніцтва павінна адыграць значную ролю. Ударнымі павінны сябе абвясьціць і гаспадарнікі, а таксама і тэхпэрсанал, якія павінны паставіць сваёй мэтай рацыяналізацыю гаспадаркі, з такім разьлікам, каб пры найменшых выпадках даць максымальны эфэкт.

САЦЫЯЛІСТЫЧНАЕ СПАБОРНІЦТВА ПАВІННА СТАЦЬ АСНОЎНЫМ МЭТАДАМ РАБОТЫ

Максымальная садзейнасьць далейшаму разьвіцьцю сацспаборніцтва і арганізацыі ўдарніцтва не павінна зыходзіць з парадку дня работы як прафесыянальных, так і гаспадарчых органаў. Трэба як мага больш скарыстаць сацспаборніцтва для паскарэньня тэмпаў работы і паляпшэньня яе мэтадаў.

Кожны дзень прыносіць усё новыя і новыя весткі аб уступленьні ў сацспаборніцтва цэлых заводаў і цэхаў швэйнай прамысловасьці, дрэваапрацоўчай, запалкавай, якія абвяшчаюць сябе ўдарнымі. Па 45 прадпрыемствах, падлеглых ВСНГ БССР, з 1-га кастрычніка да 1-га сьнежня колькасьць брыгад павялічылася з 148 да 453, прычым колькасьць ударнікаў узрасла з 1.482 чал. да 5.356 чалавек. Аднак, у цэлым па ўсёй прамысловасьці гэты рух яшчэ слабаваты. **Колькасьць ударнікаў на 1 сьнежня ў адносінах да агульнага ліку рабочых, занятых у гэтых прадпрыемствах, пакуль што складае ўсяго капя 30 проц.** Па радзе прадпрыемстваў гэты процант яшчэ меншы. **Ёсьць і прадпрыемствы, якія зусім прайшлі міма гэткага важнага руху, як сацспаборніцтва.** Так, кардонная фабрыка імя Леніна, на якой працуе каля 50 чал., паведамляе, што «у выпадку малой колькасьці рабочых на фабрыцы, рабочыя брыгады ня вылучаны». Аб тым-жа паведамляюць чыгуна-ліцейны завод «Камінтэрн», лесапільна-бачарны завод «Спартак» і інш. З такімі адносінамі да вялікай справы і «казённым дабрабытам» далёка заехаць нельга.

Хоць за апошні час і ёсьць некаторы пералом у рабоце апарату, аднак, гэты тэмп яшчэ недастатковы. Лепшым пацьвярджэньнем гэтага можа служыць той факт, што цэлы рад непараўменьняў у рабоце прамысловасьці зьяўляецца вынікам ня зусім выразнай работы апарату, які слаба або з вялікім спазьненьнем рэагуе на арганізацыйна-тэхнічныя недахопы, якія ёсьць.

У гэтых адносінах асаблівую ўвагу зварачае на сябе вельмі мярудная разгортваньне работы па складаньні штомесячных калькуляцый, якія павінны «стаць асноўным матар'ялам для тэхнічнага кіраваньня і мерапрыемстваў па рацыяналізацыі» (пастанова ЦК УсеКП(б) ад 5 сьнежня 1929 г.). Зусім недапушчальным зьяўляецца, калі мы да гэтага часу ад пераважнай часткі прадпрыемстваў ня маем калькуляцый за кастрычнік і лістапад месяцы. Трэба, каб бухгальтэрыя і статыстыка на гэтым вучастку работы абвясьцілі сябе ўдарнымі і сапраўды дапамаглі сваім удзелам выканаць тыя задачы, якія ў сучасны момант стаяць перад прамысловасьцю.

Вось тыя асноўныя мерапрыемствы, якія павінны быць праведзены ў жыцьцё дзеля таго, каб дырэктыва аб зьніжэньні сабекошту была бясспрэчна выканана.

А. ШУЛЬМАН.

Прыём у рэспубліканскую школу прафруху

15-га студзеня пачнуцца заняткі ў рэспубліканскай школе прафруху пры ЦСПСБ. Першы набор разьлічан на 50 чалавек. Прымаюцца таварышы, якія маюць ня менш чым 3-хгадовы вытворчы стаж і ня менш 2-хгадовага стажу нізавой кіруючай прафработы. Курсанты забясьпечваюцца інтэрнатам і стыпэндыямі ў разьмерах 30 руб. у месяц. За сем'ямі курсантаў акрэсьлены таго заробак.

ШТО ВЫЯВІЛА НАРАДА СТАРШЫНЬ ЦП

Старшыні ЦП саюзаў зьбіраліся вельмі мярудна. Загадчык АТЭ ЦСПСБ т. Розін нэрвова званіў па ўсіх тэлефонах, склікаючы старшынь ЦП. Усё-ж а паўгадзінным спазьненьнем прышлося нараду адкрыць пры наяўнасьці 5-ці старшынь ЦП і аднаго інструктара.

Гэта лішні раз паказвае, як павольна нашы прафпрацаўнікі паварочваюцца **«тварам да вытворчасьці».**

* * *

Даклад аб выкананьні прамфінпляну ў кастрычніку і лістападзе зрабіў намесьнік старшыні ВСНГБ т. **Баль.** «Зьвязда» падрабязна ўжо асьвятляла вынікі работы нашай прамысловасьці за першыя два месяцы новага гаспадарчага году. Па радзе галін прамысловасьці мы маем недавыкананьне вытворчых праграм, ня гледзячы на колькасны рост рабочай сілы—у кастрычніку на 2,5 проц., у лістападзе—на 1,5 проц. У адносінах паказальнікаў па працы (прадукцыйнасьць працы і заработная плата) па мэталяапрацоўчай, гарбарна-абутковай прамысловасьці і вытворчасьці акуляраў мы таксама маем нездавальняючыя вынікі. Весткі аб зьніжэньні сабекошту ёсьць яшчэ не па ўсіх галінах вытворчасьці **(гэта гаворыць аб «тэмпах» работы апаратаў нашых трэстаў).** Але першыя ўжо зводкі з фронту зьніжэньня сабекошту сыгналізуюць няўважлівасьць да гэтага пытаньня. Мэталяапрацоўчая прамысловасьць зьнізіла сабекошт прадукцыі замест 14,7 проц. толькі на 6 проц., папяровая—замест 12,2 проц.— у кастрычніку на 7,5 проц., а ў лістападзе—на 4 проц. і г. д.

— Гэта ў значнай меры тлумачыцца тым,—кажа т. Баль,—што **прафсаюзы ў апошнія два месяцы зусім забылі аб сваіх вытворчых задачах.** Узяць хоць-бы пытаньне аб прагулах. Ня гледзячы на агульныя здавальняючыя даныя, па асобных прадпрыемствах ёсьць павышэньне колькасьці прагулаў. Напрыклад, па галянтарайнай фабрыцы прагулы па пягрунтоўных прычынах вырасьлі з 0,07 проц. у кастрычніку да 0,25 проц. у лістападзе.

У заключэньне т. Баль расказаў аб тым, што прадпрыймае ВСНГБ для паляпшэньня становішча.

* * *

Кароткія інфармацыі старшынь ЦП саюзаў. Пацьвярджаецца, што прафарганізацыі нічога не зрабілі, каб у апошнія месяцы мабілізаваць увагу рабочых мас на барацьбу з труднасьцямі на вытворчасьці. Старшыня Белкамітэту саюзу **харчавікоў** ведае аб тым, што на заводах «Чырвоная Зара» і «Пралетары» адбыліся гэтымі днямі вытворчыя нарады, але ня ведае, якія пытаньні яны абгаворвалі. У саюзе ёсьць весткі толькі аб рабоце прадпрыемстваў Харчтрэсту, ад іншых трэстаў вестак няма. ЦП саюзу **дрэваапрацоўшчыкаў** таксама ня ведае аб рабоце прадпрыемстваў—Лесбел гэтых вестак не прадставіў. Іншыя-жа крыніцы інфармацыі (фабзаўкомы, акраддзяленьні саюзу) маўчаць. Няма ніякіх вестак аб рабоце прадпрыемстваў і ў Белкамітэце саюзу **мэталістых.** Праўда, т. Арэшка—сакратар саюзу—гэтым пытаньнем «цікавіўся», але нічога канкрэтнага паведаміць ня мог. Такое-ж становішча ў Белбюро ЦК саюзу **чыгуначнікаў.**

На рэшце саюзаў сёе-тое робіцца, але толькі «сёе-тое». **Сур'ёзнага перапому ў прафсаюзнай рабоце яшчэ няма.**

Значная частка віны падае за гэта **на работнікаў ЦСПСБ,** якія заварушыліся толькі пасьля таго, як друк забіў трывогу. Во і нарада старшынь саюзаў, што адбылася пазаўчора, **першая такая нарада за ўвесь першы квартал.**

* * *

У спрэчках выявіўся яшчэ рад ненармальных зьявішч.

ВСНГБ і трэсты мала ўвагі аддаюць пытаньням забясьпячэньня прадпрыемстваў сырцом і матар'ялмі, таму на некаторых прадпрыемствах былі перабоі ў рабоце. Між тым паляпшэньне забясьпячэньня ва многіх выпадках залежыць **ад выразнасьці работы апаратаў гаспадарчых органаў.** Ні адзін трэст **па сваёй ініцыятыве** не паставіў перад сваёй прафарганізацыяй пытаньня аб недавыкананьні вытворчых праграм. Апараты некаторых трэстаў працуюць вельмі дрэнна і да гэтага часу ня маюць поўных вестак аб рабоце прадпрыемстваў за кастрычнік і лістапад (Лесбел, Мэталітрэст і інш.). Між тым, ні адно цэнтральнае праўленьне саюзу ня ставіць гэтага пытаньня перад **эканомкамісіяй** адпаведнага трэсту. На прадпрыемствах усё яшчэ востра стаіць пытаньне аб штодзённым уліку вынікаў сацыялістычнага спаборніцтва і інфармаваньне аб іх рабочых.

На некаторых прадпрыемствах заработная плата перавысіла ўжо памянёныя прамфінпляны, тады як кантрольныя лічбы па прадукцыйнасьці працы далёкам ня выконваюцца. Павольна ідзе перагляд норм выпрацоўкі і расцэнак у адпаведнасьці з пунктамі калгаданаваго. На «Камунары», напрыклад, яшчэ абгаворваюцца **прынцыпы** перагляду норм. Гэта пагражае зрывам выкананьня паказальнікаў па працы, якія ўстаноўлены прамфінпляномі.

Да гэтага часу няма яшчэ поўнага кантакту ў рабоце гаспадарчых органаў і прафсаюзаў. Звычайнае зьявішча, калі на важнейшых нарадах гаспадарнікаў **прад стаўнікі прафсаюзаў адсутнічаюць.** Адсюль—поўная непаінфармаванасьць апошніх у гаспадарчай рабоце.

* * *

Нарада вызначыла рад канкрэтных мерапрыемстваў, якія павінны стварыць пералом у рабоце прафарганізацый і ў выкананьні прамфінпляну.

П—н.

Вялікія зрывы

ў працы папяровай прамысловасьці

Ф-ка імя Сталіна павялічыла сабекошт на 12 проц.

Вынікі работы папяровай прамысловасьці за першыя два месяцы—кастрычнік, лістапад--бягучага году зусім нездавальняючыя. **Недавыпрацоўка па ўсіх фабрыках папяровай прамысловасьці ў кастрычніку выяўлялася ў 4,9 проц., а ў лістападзе—14,6 проц.**

Такія адмоўныя вынікі работы за гэтыя два месяцы ствараюць вялікую пагрозу па выкананьні гадавога пляну.

Калі прасачыць за работай прадпрыемстваў спачатку году, дык трэба паказаць, што прычыны недавыпрацоўкі выкліканы не якімі-небудзь абставінамі, незалежнымі ад прадпрыемстваў, а іменна знаходзіцца, галоўным чынам, у слабаватай рабоце **саміх-жа** фабрык. Так, на фабрыцы «Гэрой Працы» і «Чырвоная Зорка» ёсьць значнае павялічэньне гадзінных прастояў. Асабліва высокія прастоі наглядаюцца на фабрыцы «Прафінтэрн», якія дасягнулі ў кастрычніку 18 проц., а ў лістападзе—16 проц., замест 8 проц., прадугледжаных плянам.

На фабрыцы імя Сталіна недавыпрацоўка пляну дасягнула нават 31 проц., у выніку гэтага мы маем ня толькі зьніжэньне сабекошту, але **значнае павялічэньне сабекошту ў кастрычніку да 11 проц., а ў лістападзе—каля 21 проц.**

З невыкананьнем прамфінпляну на выпуску прадукцыі цесна зьвязана і зьніжэньне сабекошту. У гэтай галіне мы маем зусім нездавальняючыя лічбы. Так, па ўсёй папяровай прамысловасьці было памечана зьніжэньне сабекошту на 12 проц., зьніжана толькі на 7 проц.

Паданыя лічбы гавораць нам аб тым, перад якою пагрозаю зрыву знаходзіцца выкананьне праграм па выпрацоўцы прадукцыі і зьніжэньні сабекошту прадукцыі і выкананьне пляну капітальных работ, якія залежаць ад нашых унутрызаводзкіх накапленьняў.

Трэба сказаць, што з боку заводакіраўніцтва і адміністрацыйна-тэхнічнага пэрсаналу ня было праяўлена належнай настойлівасьці да сваячасовага зьнішчэньня тых перашкод, якія заміналі ў нармальнай рабоце.

Трэба зараз-жа вакол гэтага пытаньня завастрыць увагу кіруючага адміністрацыйна-тэхнічнага пэрсаналу і ўсіх рабочых фабрыкі і зьнішчыць прастоі, дабіцца лепшага абсталяваньня, скараціць тэрміны бягучых рамонтаў і г. д.

Адлікі ад падпісчыкаў на 3-ю пазыку ня ўносяцца сваячасова ў крэдытныя ўстановы

Па БССР недаатрымана 1.357 тысяч руб.

Рад вестак гавораць аб вялікім разрыве паміж лічбамі, якія павінны былі паступіць у дзяржбюджэт ад рэалізацыі 3-й пазыкі індустрыялізацыі, і лічбамі, якія па асобных акругах фактычна паступаюць.

На 1-е сьнежня 1929 году гэты разрыў па БССР выявіўся ў суме каля 1.357 тысяч рублёў, недабор у дзяржбюджэце дасягае 38 проц. У асобных акругах гэты процант яшчэ больш. Так, па Гомельскай акрузе недабор выяўляецца ў 281,4 тысячы рублёў, або на 52 проц., па Полацкай—81,9 тыс. руб., або на 49,3 проц., па Віцебскай—283,8 тыс. руб., або на 46 проц., па Менскай—335,4 тыс. руб., або 33,3 проц., па Аршанскай 89,5 тыс. руб., або на 31 проц. і г. д.

Калі ня будуць ужыты папераджальныя меры, ёсьць небясьпека зрыву бюджэтных меркаваньняў па пазыках.

Прычынай, якая выклікала гэту небясьпеку—зьяўляецца адсутнасьць належнай работы сярод падпісчыкаў на пазыку. Няма растлумачэньня шырокім працоўным масам усёй важнасьці і неаб ходнасьці сваячасовага ўносу чарговых адлікаў, адсутнічае шырокі грамадзкі кантроль, асабліва з боку камісій садзейства і фабзаўмясцкомаў за сваячасовым утрыманьнем адлікаў з падпісчыкаў і сваячасовай здачай у крэдытныя ўстановы. Фінорганы зусім не праводзяць кантролю за сваячасовай здачай у дзяржбюджэт сродкаў атрыманых ад рэалізацыі пазыкі.

У выніку наглядаецца рад выпадкаў затрыманьня гаспадарчымі прадпрыемствамі і ўстановамі, каапэрацыяй адлікаў, атрыманых ад падпісчыкаў свайго калектыву.

Недабор сродкаў ад рэалізацыі 3-й пазыкі індустрыялізацыі вымагае прыняць тэрміновыя меры.

Трэба пачаць ва ўсіх установах, прадпрыемствах, каапэрацыйных і іншых арганізацыях праверку сваячасовай здачы атрыманых ад рэалізацыі пазыкі сродкаў, і ў выпадку выяўленьня фактаў затрыманьня прыцягваць асоб, вінаватых у гэтым, да адказнасьці. Камісіі садзейства, фабзаўмясцкомы, члены гарсавету і інш., павінны прыняць у гэтай рабоце самы актыўны ўдзел. Трэба арганізаваць праверку работы крэдытных устаноў для таго, каб апошнія сваячасова здавалі ў дзяржбюджэт сродкі атрыманыя ад рэалізацыі пазыкі.

Рабцэвіч.

У Плешчаніцкім раёне калгасы займаюць 5 проц. зямельнай плошчы

Работа ў раёне не пасьпявае за тэмпамі жыцьця

Доўгі час панавала хутарская сыстэма ў Плешчаніцкім раёне. Трэба было прыняць самыя энэргічныя і рашучыя меры, каб зямляўпарадкаваць раён, каб на месцы хутароў стварыць калгасы.

На працягу раду месяцаў нічога не рабілася ў раёне ў адносінах калектывізацыі. РВК і сельсаветы не дапамагалі калгаснаму будаўніцтву. **Пытаньне аб калектывізацыі не стаяла нават на пленуме РВК.** Толькі ў апошні час зроблен некаторы пералом.

Скасаваны праект зямляўпарадкаваньня па Ізьбішчанскім сельсавеце, які прадугледжваў пабудову пасёлкаў; скасаваны ільготны так званым «культурным гаспадаркам», правільней кулацкім і г. д.

Але дагэтуль значная колькасьць калгасаў не зямляўпарадкавана, рад калгасаў абмежаваліся прыняцьцем статуту.

Зараз у раёне палічваецца 13 калгасаў, з іх 9 арганізаваны ў гэтым годзе. **Калгасамі ахоплена толькі 5 проц. зямельнай плошчы.**

Мяркуецца ў 1930 годзе калектывізаваць 21 проц. зямельнай плошчы. як мы бачым, тэмп калектывізацыі ў раёне чарапашыны; ён нездавальняе нават самым мінімальным запатрабаваньням.

Калгасы, якія ўжо арганізаваны, аб'ядноўць невялікую колькасьць гаспадарак (1,38 проц.). **Кожны калгас у сярэднім аб'яднае ня больш 7-8 гаспадарак.**

Вялікі недахоп таксама і тое, што калгасамі не закранута зямля працоўнага карыстаньня. Калгасы пераважна будуюцца па абрэзках кулацкіх гаспадарак. З зямлі, якою карыстаецца бядняцка-серадняцкая частка, калектывізавана толькі 150 дзес. Калгасы ня маюць належнага сельска-гаспадарчага інвэнтару — ні ў адным з іх няма трактара.

Трэба адзначыць пагражаючае становішча і з запазычанасьцю калгасаў. Камуна «1-га мая» мае 8 тысяч рублёў доўгу. «Новы Шлях» — 7 тыс., імя Дзяржынскага — 5 тыс. руб. і г. д.

Калгасы ня маюць вытворчых плянаў, дрэнна абстаіць справа з вучотам і разьмеркаваньнем працы ў калектывах.

У некаторых калгасах значную частку членаў складаюць адзіночкі.

Нічога ня робіцца для прыцягненьня сродкаў насельніцтва ў калектывы.

З 13 калгасаў толькі 6 прынялі статут. У некаторых нават не праведзена аграмаджанае ворыва.

Кулакі вядуць узмоцненую агітацыю супроць калгасаў, разносяць самыя правакацыйныя чуткі, але ім не даецца належнага адпору. Сярод бядняцка-серадняцкай часткі насельніцтва не вядзецца растлумачальнай работы аб значэньні калгасаў.

У раёне 15 інстытутаў дэлегатак, але мала зроблена, каб растлумачыць ім вялізнае значэньне калгаснага будаўніцтва і зрабіць з іх агітатараў за калгасы.

Толькі ў самы апошні час намечана правесьці рад нарад з бяднячак і сераднячак.

Раённыя арганізацыі павінны рашуча перабудаваць сваю работу, пераключыцца на новыя тэмпы, інакш жыцьцё пакіне іх ззаду і стыхійная цяга бядняцка-серадняцкай часткі вёскі да новага лепшага жыцьця ня будзе накіравана па належным рэчышчы.

Г.

„НАЛЁТ" НА СТАЛОЎКІ МЦРК

Бруд, цеснага, няўважлівыя адносіны да наведвальнікаў

Культурнае абслугоўваньне рабочага спажыўца ў заняпадзе!

Партыйнае будаўніцтва

Каб праверыць, як наша каапэрацыя спраўляецца з пастаўленымі перад ёю задачамі ў галіне грамадзкага харчаваньня, рэдакцыяй «Зьвязды» пры дапамозе рабкораў і санітарных дактароў быў гэтымі днямі наладжаны налёт на рабочыя сталоўкі Менску, у тым ліку на 3 сталоўкі пры прадпрыемствах «Энэргія», «Вальшавік» і «Дрэваапрацоўшчык».

Пасьля налёту пры рэдакцыі была склікана нарада ўдзельнікаў яго, загадчыкаў сталовак, прадстаўнікоў ЦРК і рабкораў. На гэтай нарадзе брыгадзіры расказалі аб тым, што яны бачылі і выявілі ў часе налёту.

* * *

На заводзе «Дрэваапрацоўшчык» чуецца гудок. Рабочыя з усіх цэхаў сьпяшаюцца ў сталоўку, каб тут паабедаць, адпачыць і зноў вярнуцца да варштата. Але ці атрымлівае рабочы тут тое, аб чым ён марыць? Цеснота, бруд на падлозе, бруд на сталох, адсутнасьць умывальніка з ручніком і вешалкі, усё гэта, зразумела, ня можа задаволіць культурных запатрабаваньняў рабочых. Сьцены памяшканьня наскрозь прасякнуты вільгацьцю, плякаты і лёзунгі пакрыты тоўстым пластом пылу, і павуціньня. У памяшканьні няма ніводнай форткі. Кухні пры сталоўцы фактычна няма, бо ў пакоі, які прызначаны для кухні, знаходзіцца і разборачная і загатовачная, тут і брудныя вёдры з адкідамі, шмат брудных ануч. Што-ж датычыць пакою, дзе мыюць начыньне, дык ён адначасова зьяўляецца і кладоўкай для хаваньня прадуктаў (хлеба, круп), адзеньня службовага пэрсаналу, пустых бутэлек.

У склепе брыгадзіры знайшлі квашаную капусту пакрытую цвілёлью, моркву і сьвежую капусту зусім гнілую. Салёныя гуркі, сала і галяндзкі сыр ляжаць ненакрытыя. Кніга скаргаў знаходзіцца бяз увагі, бо загадчык сталовай ніколі не дае адказаў.

* * *

Сталовая № 4 на Ляхаўцы абслугоўвае рабочых гарбарні «Вальшавік». Ня гледзячы на нядаўні рамонт, на які было затрачана каля 2.000 руб., у сталоўцы [illegible] шалка і ўмывальнік. Адміністрацыя гэта тлумачыць тым, што нібы хутка гэта сталовая будзе зруйнавана. Гэтым адміністрацыя сталовай тлумачыць таксама брудную ваду ў ракавінах, побач з сталамі, дзе робяць катлеты і інш. страва. Але гэтым цяжка тлумачыць бруд і сьмецьце на падаконьніках, на паліцах. Сталовая гэта перагружана, замест 400 абедаў яна адпускае 600, ды нават і 800. За сталамі, дзе павінна сядзець 12 чалавек, у часе абеду сядзяць па 20. Некаторыя ядуць стоячы. Бываюць выпадкі, калі са складаў ЦРК прысылаюць зусім нясьвежыя прадукты, асабліва сухары, якія нават заўсёды пакрыты цвілёлью і ў такім выглядзе ідуць у катлеты. У кладовай на паліцах, дзе ляжыць хлеб,—шмат бруду і пылу. Тут і брудныя халаты, хлеб таксама брудны.

* * *

Сталоўка № 10 пры заводзе «Энэргія» даволі прасторная. Але сваім выглядам гаворыць аб тым, быццам тут ва ўдарным парадку паставілі катлы і вараць. Сталы брудныя і не выціраюцца. Загадчык сталоўкай тлумачыць гэта тым, што рабочыя ўсё роўна прыходзяць абедаць у спэцвопратках і калі пасьля кожнага выціраць, дык будзе значны выдатак на мыцьцё сарвэтак. На кухні таксама бруд. Праз кухню праходзяць усе, каму ня шкода і датыкаюцца сваёй вопраткай да сталоў, дзе гатуюць абеды. Разьдзявальні для пэрсаналу няма, брудная вопратка ляжыць побач з прадуктамі. Хлеб ляжыць побач з брудная вяроўкай і сандаліямі. Бацінкі і шнуркі побач з макаронамі. Начыньне мыецца ў вадзе, якая мяняецца толькі тады, калі становіцца зусім чорнай. За сталамі таксама цесна, падлога ў сталоўцы брудная, ніколі ня мыецца. Гэта ня наш абавязак,—адказвае загадчык сталовай,—тут па вечарох праводзіцца культработа, пяхай аб гэтым клапоціцца заводакіраўніцтва.

Плявальніц нідзе няма, афіцыянты льлюць на падлогу рэшткі з падносаў. У абедзены перапынак ніякай культработы сярод рабочых не вядзецца, ніхто гэтым ня цікавіцца. Завод «Энэргія» за апошні час значна пашырыўся, лік рабочых павялічыўся амаль у 3 разы. Будуюцца новыя карпусы, а аб такой драбніцы, як чыстая, належным чынам абсталяваная сталоўка, забыліся.

* * *

Загадчык сталоўкай № 1 сустрэў налётчыкаў ня зусім ветліва.

— Чаму вы раней не папярэдзілі адміністрацыю? Чаму вы прышлі ў такі час, калі больш усяго народу?—Вось былі першыя словы загадчыка сталоўкі.

Заля, дзе за столікамі сядзяць наведвальнікі, прасякнута дымам і нікацінам. Адміністрацыя на гэта не зварачае ніякай увагі. У сталоўцы наведвальнікі часта на вачох адміністрацыі расьпіваюць моцныя напіткі. За касай заўсёды вялізная чарга, абеду прыходзіцца чакаць па 40-50 мінут. Загадчык лічыць, што пачакаць паўгадзіны, гэта зусім нармальна. Якасьць абеду прымушае чакаць шмат лепшага. Шматлікія скаргі гаворацъ аб тым, што стравы падаюцца недаваранымі і недапечанымі. Кладовая добра абсталявана, але тутжа, побач з прадуктамі, знаходзіцца і скрынка з брудная спэцвопраткай.

* * *

У сталоўцы № 3 наведвальнікі абедаюць у верхняй вопратцы. Ня гледзячы на тое, што там ёсьць вешалка, ёю ніхто не карыстаецца, а адміністрацыя за гэтым ня сочыць. За столікамі надта цесна, каля кожнага з абедаючых стаіць яшчэ адзін і чакае. Падлога надта брудная. На кухні таксама вельмі брудна. У кладоўцы на паліцах побач з хлебам валяецца брудная спэцвопратка, тут-жа маленькія кацяняткі. На шафе ў пыле разам з усялякім рызьзём ляжаць сушаныя грыбы.

* * *

Нарэшце, пытаньне аб кадрах. Белрабсэкцыя і МЦРК гэтаму пытаньню аддаюць мала увагі. 24.000 руб., якія спачатку былі адпушчаны на фабзавучы, потым былі скарочаны да 14.000 руб. Між тым, попыт на кваліфікаваных работнікаў, у сувязі з пашырэньнем тэлектыўнага быту, значна ўзрос.

„НАЖОМ У ГРУДЗІ"

або „Здарэньне на ст. Дрыса"

(Ад нашага спэцыяльнага карэспандэнта)

21-га сьнежня гэтага году на ст. Дрыса быў скліканы сход рабочых-чыгуначнікаў і прадстаўнікоў беднаты. У ліку іншых пытаньняў стаяла пытаньне аб выключэньні з саюзу актывістага і б. члену мясцкому, рабочага т. **Вараб'ева.** У той момант, як была прагаласавана пастанова сходу—выключыць з радоў саюзу,—т. Вараб'ёў, выхапіўшы нож, усадзіў яго сабе ў грудзі.

Спалоханыя прысутныя ўцяклі ўсе да аднаго, кінуўшы Вараб'ёва, які сьцікаў крывёю.

Першую дапамогу аказалі яму маці і бацька, якія прыбеглі на месца здарэньня.

Рана аказалася не сьмяротнай. Сеньня т. Вараб'ёў зусім здаровы і спадзяемся яшчэ шмат папрацуе ў грамадзкай галіне. Што-ж прымусіла яго ўзяцца за нож і накіраваць яго сабе ў грудзі?

Аб гэтым якраз і трэба расказаць.

Тав. Вараб'ёў — спачатку рамонтны рабочы, а пасьля вылучаны вагаўшчыком — на працягу сямі год працаваў на чыгунцы. Найшоўшы добраахвотна ў Чырвоную армію ён праслужыў у ёй 5 год. Вараб'ёва ведалі, як сумленнага, актыўнага работника, які ня любіў маўчаць там, дзе маўчалі другія. Іншымі словамі — Вараб'ёў лічыў самакрытыку блізкай і важнай справай. Наколькі Вараб'ёў быў гарачым прыхільнікам самакрытыкі, настолькі **Сямёнаў** —нам. начальніка станцыі і агітпроп ячэйкі — яе ня любіў і баяўся. Нават сакратар ячэйкі **Літвінаў** хутчэй гатоў быў падтрымаць Сямёнава, чым прыхільніка самакрытыкі т. Вараб'ёва.

І вось на шырокім шляху самакрытыкі (ня ў Дрысе толькі) сустракаюцца бюракрат і п'яны забулдыга «партыец» Сямёнаў і цьвярозы, сумленны рабочы т. Вараб'ёў. Хутка Сямёнаў паказаў, што ён мае магчымасьць «сьцерці ў парашок» кожнага, хто адважыцца наўстаць на яго шляху...

Пачалася праверка ячэйкі ст. Дрыса. Беспартыйныя рабочы

Зьняць званы з цэркваў

Рабочыя-чыгуначнікі патрабуюць закрыць чыгуначную царкву

30-га сьнежня на ст. Менск МББ чыг. адбыўся агульны сход рабочых чыгункі, якія аб'ядняюць масцкомы №№ 2 і 3. На сходзе стаяла пытаньне аб зачыненьні чыгуначнай царквы.

Сход аднагалосна пастанавіў прасіць гарсавет выканаць наказ, прыняты яшчэ ў мінулым годзе, аб зачыненьні чыгуначнай царквы.

Сход пастанавіў таксама прасіць органы ўлады зьняць званы з усіх будынкаў рэлігійных культаў.

Аднечасова сход зьвярнуўся ў прэзыдыум гарсавету з просьбай — вызваліць ад абавязкаў члена гарсавета дэлегата чыгункі Акуліча, які адмовіўся даць свой подпіс пад лістом аб зачыненьні царквы, бо «я яе не будаваў, яе яе не зачыню».

БЯЗБОЖНІК.

***

Сяляне в. Старынка, **Койданаўскага раёну**, пастанавілі прасіць РВК закрыць царкву, а яе будынак перадаць загатоўчым арганізацыям пад склад для хаваньня збожжа.

ВІЦЕБСК. (Наш кар.). Агульны сход рабочых і служачых ф-кі гнутай мэблі патрабаваў ад гарсавету безадкладна зьняць усе званы з цэркваў і перадаць іх на патрэбы прамысловасьці.

***

ВОРША. (Наш кар.). Агульны сход **рабочых дэпо ст. Ворша МББ чыг.** у колькасьці 450 чал. патрабаваў ад вучпрафсожу закрыць царкву на станцыі і перадаць яе памяшканьне пад культурныя ўстановы.

Сход пастанавіў адпрацаваць адзін з дзён адначынку ў карысьць пабудовы трактара «Бязбожнік» для ўзмацненьня калектывізацыі ў падшэфным раёне.

Да пастановы агульнага сходу далучыўся цэхавы сход паравозных брыгад.

***

КОПЫСЬ. (Наш кар.). Агульны сход рабочых і служачых кафэльна-плітачных заводаў зьвярнуўся да РВК з прапановай закрыць усе царквы і сынагогі мястэчка і перадаць званы на патрэбы індустрыялізацыі.

Да пастановы рабочых далучыўся сход працоўнага насельніцтва мястэчка.

Ці ня час спыніць царкоўны звон

На другім усесаюзным зьезьдзе саюзу ваяўнічых бязбожнікаў тав. Яраслаўскі ўзьняў пытаньне аб тым, ці ня час ужо спыніць царкоўны звон.

І сапраўды, кожнай раніцой і ўвечары на пляцы Волі і на Ракаўскай вуліцы гэтыя самыя званы перашкаджаюць рабоце.

Асабліва гэта адчуваюць працаўнікі бібліятэкі і габінэту палітасьветнікаў, якія зьмяшчаюцца ў будынку каля Ракаўскай царквы.

Царкву наведваюць — дзесятак-два бабулек, ды былых «статскіх советников». Званы-ж царквы перашкаджаюць працаваць сотням чытачом і наведвальнікаў, якія кожны дзень прыходзяць у бібліятэку і габінэт. Рабочыя, занятыя на розных работах, якія жывуць ва дварэ каля царквы, таксама часта скардзяцца, што царкоўны звон перашкаджае адпачынку пасьля цяжкай працы.

Мая прапанова — пакончыць з царкоўным звонам. Званы прынясуць большую карысьць індустрыялізацыі краіны, калі яны пойдуць у заводзкі кацёл, чым калі яны будуць вісець на званіцах ачагоў дурману.

С—н.

Якім дактаром забараняецца прыватная практыка

Што пастанавіў саюз мэдсанпрацы

ЦП саюзу мэдсанпрацы БССР і рэспубліканская дактарская сэкцыя канчаткова зацьвердзілі сьпіс пасад, несумяшчальных з прыватнай практыкай. У гэты сьпіс уваходзяць: дактары, якія працуюць у апараце органаў аховы здароўя, галоўныя дактары і іх намесьнікі, дактары, якія жывуць пры стацыянарах, незалежна ад займанай пасады, загадчыкі аддзяленьнямі ў больніцах, раённыя дактары (дактары кватэрнай дапамогі), дактары страхкас, мэдычна-кантрольных камісій, судова-мэдычныя экспэрты, санітарныя дактары.

Дактары, якія маюць прыватную практыку, не дапушчаюцца да загадваньня рэнтгенаўскімі габінэтамі, лябараторыямі і г. д. і ня могуць быць выбраны на саюзную і кіруючую работу.

Гэта пастанова распаўсюджваецца і на зубных дактароў.

У ЦП саюзу і рэспубліканскую сэкцыю паступіла шмат заяў ад дактароў аб адмаўленьні ад прыватнай практыкі і зьняцьці шыльдаў.

27 дактароў г. Слуцку дмовіліся ад прыватнай практыкі

Агульны сход дактароў г. Слуцку, лічачы, што заняткі прыватнай мэдычнай практыкай несумяшчальны з годнасьцю савецкага доктара - актывістага, пастанавілі зусім адмовіцца ад прыватнай практыкі і выклікалі на спаборніцтва, на 100-процантную адмову ад прыватнай практыкі Менскую і Бабруйскую акруговыя доктарскія сэкцыі.

Арбітрам выбраны цэнтральнае праўленьне саюзу мэдсанпрацы.

На сходзе 27 дактарамі быў падпісаны адпаведны акт.

Зьняцьце з работы за сувязь з прыватнікам

За сувязь з прыватнікам і кляйменьне вагі прыватнікам прэзыдыумам ВСНГ зьняты з работы загадчык палаты мер і вагі тав. **Чэкан** і бухгальтар палаты **Бурдзелька**. Намесьніку загадчыка палаты тав. Кватковскаму вынесена суровая вымова з апублікаваньнем друку.

***

Прэзыдыум ВСНГ пастанавіў зьняць з работы дырэктара фабрыкі «Дняпроўская Мануфактура» тав. **Кірэева** за бесгаспадарчасьць і невыкананьне дырэктыў ВСНГ аб зьніжэньні сабекошту прадукцыі.

Падрыхтаваць кадры рахункаводаў для калгасаў

Пазаўчора адбылася гарадзкая канфэрэнцыя членаў Менскага АРУ (аб'яднаньня работнікаў вучоту). Аспоўная ўвага канфэрэнцыі была зьвернута на пытаньне аб кадрах рахункаводаў для калгасаў.

Выступаўшыя таварышы адзначалі, што НКА, Белкалгассаюз і НКЗ да гэтага часу яшчэ ня маюць пляну падрыхтоўкі неабходных кадраў, каб забясьпечыць калгасы патрэбнай рабсілай—рахункаводамі. Колькасьць калгасаў ужо зараз перавысіла 2.000, а на працягу 1930 году дасягне 4000. Калі ўзяць пад увагу, што кожнаму калгасу патрэбен будзе ня менш, чым адзін рахунковы працаўнік, перад намі стаіць задача пад рыхтаваць ня менш 4.000 чалавек. Канфэрэнцыя адзначыла, што да гэтага часу ў гэтай галіне нічога ня зроблена.

Канфэрэнцыя лічыць неабходным у тэрміновым парадку арганізаваць сетку кароткатэрміновых рахунковых курсаў, уключыць у навучальны плян сялянскіх сямігодак вывучэньне рахункаводзтва і рад іншых мерапрыемстваў. Канфэрэнцыя лічыць патрэбным пры пасылцы брыгад у калгасы абавязкова ўключаць прадстаўнікоў работнікаў вучоту. Канфэрэнцыя прызнала мэтазгодным арганізаваць шэфства аб'яднаньняў работнікаў вучоту над асобнымі калгасамі.

Карысное пачынаньне хірургічнай клінікі

Шэфства над койданаўскай райбольніцай

1-я хірургічная клініка Белдзяржуніверсытэту ўзяла мэдычнае шэфства над Койданаўскай райбольніцай. Ужо выяжджаў прадстаўнік у Койданава для абмеркаваньня на месцы пытаньня канкрэтнай працы.

Бяручы шэфства на больніцай, клініка дапаможа палепшыць работу больніцы, наладзіць хірургічную справу (апэрацыі і інш.) і г. д. Клініка мае на мэце арганізаваць рад лекцый на мэдычныя тэмы, а таксама арганізаваць гурткі «першай дапамогі» і інш. Будзе створана таварыства з раённых дактароў для паглыбленьня іх ведаў. Апрача таго, клініка разгорне ў раёне культурна-санітарную работу, галоўным чынам. у камунах і калгасах. Можна спадзявацца, што гэта работа дасьць вялікія вынікі.

І. С.

Гаспадарчыя арганізацыі не падрыхтаваны да будаўніцтва 1930 г.

Прэзыдыум ВСНГ заслухаў інфармацыю будаўнічай групы па пытаньні аб падрыхтоўцы да будаўніцтва 1930 г. Абсьледваньне, якое правяла будаўнічая група, выявіла, што з 84 праектаў новага будаўніцтва скончаны толькі 35. Трэсты да гэтага часу яшчэ не заключылі дагавораў з будаўнічымі арганізацыямі на аб'екты будаўніцтва і ня ўнесьлі авансаў. Прэзыдыум адзначыў слабую падрыхтаванасьць трэстаў да будаўніцтва і запрапанаваў неадкладна падрыхтаваць усе праекты і заключыць дагаворы з будаўнічымі арганізацыямі. Даны таксама дырэктывы аб далейшым зьніжэньні сабекошту будаўніцтва, мэханізацыі работ і г. д.

15 студзеня пачынаецца суд над прасьледвацелямі рабкора Багайскага

Закончана сьледзтва па справе аб самагубстве рабкора Багайскага. Справа будзе разглядацца выязной сэсіяй Вярхоўнага суду 15-га студзеня ў Шклове на фабрыцы «Спартак» у паказальным парадку.

На лаўцы падсудных—б. загадчык электрастанцыі **Шкураў** і 2 старшыя машцёры—**Паплаўскі** і **Моцны**.

Шкураў, Паплаўскі і Моцны абвінавачваюцца ў тым, што ка працягу 3-х год сыстэматычна прасьледвалі і тэрарызавалі рэдактара насьценнай газэты «Спартакавец» т. Багайскага, у выніку чаго ён пакончыў жыцьцё самагубствам.

Усе трое прыцягваюцца да адказнасьці па 70 арт. КК (удзел у тэрарыстычным акце).

Прыцягнуты да адказнасьці і былы дырэктар ф-кі **Карчагін**, але справа аб ім прыпынена з прычыны таго, што ён уцёк і пакуль што ня знойдзены.

У якасьці грамадзкіх абвінаваўцаў выступяць прадстаўнікі друку і прафсаюзаў. Дзяржаўным абвінаваўцам вызначаны пракурор Вярхоўнага суду т. **Міхайлаў**.

Па справе выклікана каля 50 сьведкаў. Суд працягнецца ад 4 да 5 дзён.

ХРОНІКА МОПР'у

АБСЬЛЕДВАНЬНЕ КАСТРЫЧНІЦКАГА РК МОПР'У.

У сувязі са значным паслабленьнем работы ў Кастрычніцкай арганізацыі МОПР'у, Менакругком вылучыў камісію для абсьледваньня становішча арганізацыі ў двухтыднёвы тэрмін.

9.000 РУБ. У КАРЫСЬЦЬ ПАЛІТЗЬНЯВОЛЕНЫХ

Па горадзе Менску ўжо паступіла каля 9.000 руб. у фонд кампаніі зімовай дапамогі палітзьняволеным. Фрунзаўскі РК амаль выканаў заданьне больш чым на 100 проц., значна адстае Кастрычніцкі РК.

МЕСЯЧНІК ВЯРБОЎКІ СЯЛЯН у МОПР

З 1-га студзеня 1930 году Менакругком МОПР'у праводзіць па ўсёй акрузе **месячнік вярбоўкі сялян у рады МОПР'у.** З гэтай мэтай АК МОПР'у пасылае **2 выязныя мопраўскія брыгады ў Капыльскі і Чэрвенскі раёны**, якім даручана праводзіць сялянскія сходы па вёсках, калгасах і саўгасах. Асабліва зьвернута ўвага ў часе правядзеньня месячніка на ўдзяленьне ўсіх калгасьнікаў, рабочых саўгасаў і жанчын дэлегацкіх сходаў у рады МОПР'у.

АКРУГОВЫЯ АГІТПРАПКАНФЧЭРЭНЦЫЯ МОПР'У

У мэтах узмацненьне агітвыхаваўчай работы МОПР'у ў нізавых арганізацыях Менакругком склікае на 21-га і 22 студзеня 1930 г. **акруговую агітпрапкафэрэнцыю МОПР'у** з наступным парадкам дня: 1. Задачы агітпрапработы ў арганізацыях МОПР'у і 2. Роля мопраўскага друку ў агітпрапрабоце. На канфэрэнцыю будзе выбрана каля 600 дэлегатаў. Дэлегаты на гэтай канфэрэнцыі будуць выбраны пераважна з членаў МОПР'у—чытачоў часопісі «Путь МОПР'у». Да канфэрэнцыі будзе наладжаны паказальны куток МОПР'у і выстаўка літаратуры.

Новы сакратар Менскага акругкому камсамолу

Скончыўся пленум Менскага акругкому камсамолу. У зьвязку з водзывам тав. Папянкова, у распараджэньне ЦК КП(б)Б сакратаром акругкому выбраны былы загадчык АПА акругкому т. Маслоўскі. Загадчыкам АПА выбраны тав. Рубенчык, былы сакратар Барысаўскага камітэту.

МЕНСК

Праект новага тэатру ў Менску

Спэцыяльная камісія НКАсьветы выпрацавала праект будынку новага вялікага тэатру ў Менску.

Праект прадугледжвае пабудову тэатру, які б зьмяшчаў: вестыбюль на 1.000 чалавек, курыльню—на 100 чал., 5 пакояў для адпачынку, бібліятэку-чытальню з 3-х пакояў, пакой для дзяцей, кіно для 500 чал., канцэртную залю на 1.500 чал. і г. д. Відоўна тэатру будзе зьмяшчаць каля 3.000 чалавек.

Кіно-тэатры ў калгасах

Калегія Наркамасьветы БССР зацьвердзіла плян кінофікацыі калгасаў на 1929-30 год. Белдзяржкіно, згодна пляну, арганізуе сетку кіно-перасовак з разьліку—адна перасоўка на 12.000 насельніцтва. Усяго ў раёны суцэльнай калектывізацыі будзе накіравана 68 кіно-перасовак. З вясны ў калгасах пачнецца пабудова 10 будынкаў для кінотэатраў. На гэту мэту патрабуецца 276 тысяч руб.

Новыя рабочыя клюбы

СНК БССР адпусьціў дадаткова 100 тысяч рублёў на сканчэньне пабудовы новых рабочых клюбаў харчавікоў у Менску і хэмікаў—у Барысаве. Апрача таго адпушчана на гэту-ж мэту 25 тыс. руб. доўгатэрміновага крэдыту. Сродкі разьмеркаваны па саюзах харчавікоў і хэмікаў.

Пабудова трактара «Фізкультурнік Беларусі». Па ініцыятыве нізавых арганізацый, ВСФК пастанавіў распачаць па фізкультурных арганізацыях збор сродкаў на пабудову трактара «Фізкультурнік Беларусі».

ПАЧАЛАСЯ ПРАДАЖА БІЛЕТАЎ НА КУРОРТЫ

Беларускае курортнае бюро пачынае продаж месц на курортах на летні сэзон 1930 году.

Каб палепшыць сацыяльны склад курортных хворых, месцы ў першую чаргу будуць даваццa рабочым. Рабочыя, пры падачы заявы ў бюро да 15-га лютага, будуць карыстацца растэрміноўкай у плацяжы на 9 месяцаў; тыя-ж што пададуць заявы пасьля 15-га лютага, будуць карыстацца растэрміноўкай на 6 месяцаў. Кошт месц для рабочых будзе значна зьменшаны.

Спорт

Агляд фізкультурнай работы ў Клімавіцкім раёне. Прэзыдыум ВСФК пастанавіў правесьці агляд фізкультурнай работы ў Клімавіцкім раёне. Агляд пачнецца ў студзені і будзе скончаны на працягу двух тыдняў.

Сацыялістычнае спаборніцтва паміж фізкультурнікамі. ВСФК вылучыў дэлегацыю пад старшынствам т. Лева, якая 4-га студзеня выяжджае ў Смаленск для заключэньня сацыялістычнага дагавору з фізкультурнымі арганізацыямі Заходняй вобласьці.

ПАВЕДАМЛЕНЬНІ

ЦБ сэкцыі навуковых працаўнікоў паведамляе сваім членам, што **выпіска замежнай літаратуры** адбываецца ў клюбе навуковых працаўнікоў ад 7 да 9 гадз. увечары 4, 9, 14, 19, 24 і 29 кожнага месяца. Усе даведкі адносна выпіскі можна атрымаць у тыя-ж тэрміны.

У клюбе нархарч (вул. Энгельса, 6) 3-га студзеня, а 7-й гадз. увеч. адбудзецца агульны **сход хатніх работніц мясцкому № 2.**

Менскае мэдычнае таварыства паведамляе, што 3-га студзеня, а 9 гадз. увеч. у клюбе «Мэдпрацаўнік» адбудзецца XXIV пасяджэньне т-ва. Парадак дня: дэманстраваньне хворых, кансультацыя і артапэдыя (дац. М. Шапіра); клінічная характарыстыка гепатаргіі (д-ры Ліпец і Я. Шапіра).

Дом Камасьветы. 4-га студзеня, а 6½ гадз. увеч. адбудзецца **кансультацыя шэфскага актыву**, які выяжджае на вёску для правядзеньня антыкаляднай кампаніі. Шэфтаварыствы сумесна з яч. «Бязбожнік» павінны да гэтага часу вылучыць т.т. для паездкі ў падшэфныя сельсаветы і дакладна паведаміць ім аб кансультацыі.

Дом Камасьветы. а 7-й гадз. ўвеч. адбудзецца вечар актыву савецкіх ячэек. Даклад аб задачах работы савецкіх ячэек зробіць інструктар ЦК КП(б)Б тав. Танхілевіч. Пасьля дакладу — выступленьне укр. вакальнага квартэту і кінофільм. Білеты па РК КП(б)Б.

У Мен. АК МОПР'у (Савецкая, 87) 2-га студзеня 1930 году а 7-й гадз. увечара адбудзецца пасяджэньне прэзыдыуму АК. Павінны зьявіцца члены і кандыдаты прэзыдыуму, члены і кандыдаты АК і рэўкамісіі, якія знаходзяцца ў Менску. Запрашаецца Мопр. актыў.

Клюб навуковых працаўнікоў. Заўтра, 2-га студзеня 1930 г. адбудуцца чарговыя заняткі марксыцка-ленінскага гуртку.

САЮЗ МЭДСАНПРАЦЫ

2-га студзеня (у чацьвер) у клюбе «Мэдпрацаўнік» (Рэвалюцыйная, 2) будуць абвешчаны вынікі чысткі апарату ЦП саюзу мэдсанпрацы. Запрашаюцца ўсе члены саюзу мэдсанпрацы.

ДОМ СПЭЦЫЯЛІСТАЎ СЕЛЬСКАЕ І ЛЯСНОЙ ГАСПАДАРКІ.

(Дом Селяніна)

У чацьвер, 2-га студзеня ў залі Дому Селяніна адбудзецца першая лекцыя Палітвузу Дому Спэцыялістаў, на тэму —«Праблема стварэньня пралетарскіх кадраў». Дакладчык—народны камісар Асьветы тав. **Платун.**

Пачатак а 6-й гадзіне ўвечары.

Запрашаюцца таксама члены саюзу СГДР.

Адказны рэдактар ЯН. АСЬМОЎ.

БЕЛДЗЯРЖВЫДАВЕЦТВА

ЧЫРВОНАЯ БЕЛАРУСЬ

ІЛЮСТРАВАНАЯ ДВУХТЫДНЕВАЯ ЧАСОПІСЬ

Адказны рэдактар МІХАСЬ ЧАРОТ

24 НУМАРЫ У ГОД

„ЧЫРВОНАЯ БЕЛАРУСЬ" будзе высьвятляць у мастацкім слове і багатай ілюстрацыі рост і разьвіцьцё сацыялістычнага будаўніцтва БССР і ўсяго Савецкага Саюзу, рэканструкцыю народнае гаспадаркі, посьпехі індустрыялізацыі і калектывізацыі сельскае гаспадаркі, шляхі культурнае рэвалюцыі.

„ЧЫРВОНАЯ БЕЛАРУСЬ" будзе знаёміць чытача з рэвалюцыйнымі падзеямі ўсяго сьвету, а таксама і з важнейшымі зьявішчамі сусьветнай эканомікі і культуры.

„ЧЫРВОНАЯ БЕЛАРУСЬ" зьмяшчае: апавяданьні, вершы, нарысы, падарожжы, фэльетоны, артыкулы з палітычнага, эканамічнага, культурнага і мастацкага жыцьця. Мастацкія навінкі, ілюстрацыі, рэпрадукцыі карцін выдатнейшых мастакоў, а таксама гумарэскі, пародыі, старонкі сатыры і гумару з адпаведнымі шаржамі і карыкатурамі.

„ЧЫРВОНАЯ БЕЛАРУСЬ" будзе адлюстроўваць усё бягучае жыцьцё мастацтва як савецкага, так і сусьветнага, найбольш буйныя зьявішчы літаратуры, тэатру і кіно.

Часопісь „ЧЫРВОНАЯ БЕЛАРУСЬ" будзе ўва ўсіх кнігарнях БДВ, кнігарнях ЦРК, кіёсках контрагенцтва друку і выдав. „Правда", чыгуначных кіёсках, паштовых кіёсках і ўсіх газэтаносцаў ува ўсіх гарадох, мястэчках БССР.

ПАДПІСНАЯ ЦАНА НА 1930 Г.

На 1 год	3 руб. —
На паўгода	1 руб. 50 к.
На 3 месяцы	— 75 к.

Цана асобнага нумару 15 кап.

№ 1 ПЫТАЙЦЕ)—(Ў)—(ГАЗЭТЧЫКАЎ.

ПАДПІСКУ ПРЫМАЮЦЬ:

Бюро падпіскі БДВ (Менск, Савецкая 63), Цэнтральная кнігарня БДВ, усе акруговыя аддзяленьні БДВ, кнігарні ЦРК, кіёскі контрагенцтва друку, Беларускае газэтнае бюро, усе паштовыя аддзяленьні, усе ЛІСТАНОСЦЫ ЯК У ГАРАДОХ, ТАК І У ВЁСКАХ І АСОБЫ, ЯКІЯ МАЮЦЬ ПАСЬВЕДЧАНЬНІ.

Белдзяржвыдавецтва ДРУКУЕЦЦА І ХУТКА ВЫЙДЗЕ

Сталін. ПЫТАНЬНІ АГРАРНАЙ ПОЛІТЫКІ СССР

(Прамова на канфэрэнцыі аграрнікаў-марксыстаў 27 сьнежня 1929 году).

КІНО і ТЭАТР

КІНО-ТЭАТР КУЛЬТУРА — Вясёлая кат. у 6 ч. вытворчасьці „Межрабпом-фільм" **120.000 НА ГОД** ЗВЫШ ПРАГР. кіно-хронікі Савкіно № 71. Пачатак роўна а 7 гадз. увеч. Каса—ад 5 гадз.

КІНО ПЕТЭРБУРГСКАЕ — **На прычыне вялікага посьпеху 2-гі тыдзень** Выключна дакумэнтальны фільм **САЛАЎКІ** (Салавецкія лягеры асабліва гарызначэньня) Пачатак 1-га сэансу а 7 гадз. Каса—ад 5 гадз.

КІНО ПРАЛЕТАРЫЯ — **СЬМЯРОТНЫ НУМАР** Драма з цыркавога жыцьця ў 6 частках. ЗВЫШ кіно-ПРАГР. хроніка Савкіно № 70. Пачатак а 7 гадз. увеч. Каса ад 5 г. 30 м

1-ы дзіцячы кіно-тэатр „Жэ Пінэр" (Бурынак кіно „Пралетарыя") — **Танька-Шынкарка** мэлё-драма ў 6 частках паводле апавесьці Кастуся Мірнева „ПРОТИВ ОТЦА" Каса адчынена штодзённа ад 2 гадз. дня.

КІНО СПАРТАК — З панядзелка, 30 сьнежня — нямецкі баявік **СКРЫПАЧ з ФЛЁРЭНЦЫІ** драма ў 7 част. У галоўных ролях сусьветны артысты **КОНРАД ВЭЙДТ** і **Елізавета БЭРГНЕР** Пачатак 1-га сэансу а 6 гадз. 30 м. — КАСА—ад 5 гадз. —

ДОМ АСЬВЕТЫ Сёньня, 1 студзеня — Гол. Дзярж. тэатрам падкіраўн. Галубка для членаў саюза будзе пастаўлен. п'еса Галубка **„Пінская мадонна"** Пачатак а 8 г. 30 м. увеч. Білеты ў канц. Дому з 12—2 і з 6—10 г. штодзённа

Дзяржаўны Яўрэйскі Тэатр БССР ЧАЦЬВЕР, 2 студзеня—спэктакль для Дому Камасьветы імя К. Маркса — Прэм'ера Э. ТОЛЬЛЕР **ГОП-ЛЯ, ЖЫВЁМ** Білеты ў Доме Камасьветы імя К. Маркса — Пачатак а 8 гадз. 30 мін. увеч. —

Огонек в 1930 году дает приложение— 24 книги (около 4.500 стр.). **„БИБЛИОТЕКА РОМАНОВ"** 24 КНИГИ выдающихся произведений мировой литературы, исторических, бытовых, революционных романов миров. классиков и лучших современников Запада. ПОД ОБЩЕЙ РЕДАКЦИЕЙ М. ГОРЬКОГО.

Произведения СВИФТА, ГЮГО, СТЕНДАЛЯ, ФЛОБЕРА, ДОДЭ, ДЕКАВА, ГОТЬЕ, МОПАССАНА, ВАССЕРМАНА, МАНА, ЛЕСАЖА и др. Большинство произведений переведено заново лучшими советскими переводчиками. Каждая книга, имеющая около 200 стран и набранных четким, убористым шрифтом, будет представлять собой законченное целое. Двадцать четыре книги, снабженных вступительными статьями и примечаниями известных советских литературоведов-марксистов, составят ценное дополнение к библиотеке любого культурного читателя Советского Союза.

УСЛОВИЯ ПОДПИСКИ НА „ОГОНЕК" С ПРИЛОЖЕНИЯМИ

		Руб.	к.
1 АБОНЕМЕНТ	„Огонек" с „Библ. Романов" (36 №№ „Огонька" и 24 книги романов)—год—15 р. Допускается рассрочка: при подписке—4 р., к 1 марта—4 р. 50 к., к 1 мая—3 р. 50 к., к 1 июля—3 р.	15	—
2 АБОНЕМЕНТ	„Огонек" с „Библ. „Огонек" (36 №№ „Огонь а" и 72 книжки „Библ. Огонек")—новейшие произведения советских и иностранных писателей. На год—10 р., 6 мес.—6 р. 50 к., 3 мес.—3 р., 1 мес.—1 руб.	—	—
3 АБОНЕМЕНТ	„Огонек" с „Библ. Романов" и „Библ. Огонек"—год—21 р. 50 к. Допускается рассрочка: при подписке—5 р., к 1 марта—4 р., к 1 мая—5 р., к 1 июля—4 р. 50 к. и к 1 сентября—3 р.	21	50
5 АБОНЕМЕНТ	„Огонек" с „Библ. Ром." и „Жен. Журналом" 12 №№ богато иллюстр. журн. с прилож. к каждому номеру выкроечн. и контурных листов и „Детск. Уголка". Год—24 р. 50 к. Допускается рассрочка: при подписке—6 руб., к 1 марта—5 р. 50 к., к 1 мая—4 р. 50 к., к 1 июля—5 руб. и к 1 сентября—3 р. 50 к.	24	50
ОГОНЕК	36 №№ в год. ПОДПИСНАЯ ЦЕНА НА ГОД—3 р. 25 к., 6 мес. 1 р. 75 к., 3 мес.—90 к. и на 1 мес.—30 коп.	3	25

7 БЕСПЛАТНЫХ ПРЕМИЙ Все годовые подписчики по I, III и V абонементам получат ПРЕМИЮ—4 МНОГОКРАСОЧНЫЕ ХУДОЖЕСТВЕННЫЕ КАРТИНЫ размером 40х50 см. стоимостью в 3 рубля. Подписчики по всем абонементам, внесшие годовую подписную плату сразу при подписке—получат ДОПОЛНИТЕЛЬНО КОЛЕНКОРОВУЮ ТЕТРАДКУ С ЗОЛОТЫМ ТИСНЕНИЕМ для годового комплекта „Огонька" за 1930 год. Подписчики по V абонементу, также уплатившие сразу годовую подписную плату полностью, получат кроме 4-х картин и папки—большую книгу „ДОМАШНИЕ РЕМЕСЛА" в комплект 10 книжек „БИБЛИОТЕКИ ОГОНЕК".

ПОДПИСКА ПРИНИМАЕТСЯ: Изд-ном „ОГОНЕК" Москва, 6, Страстн. б. 11, и во всех киосках и отдел. Контрагенц. печати и всюду на почте.

По МАТЕМАТИКЕ и ФИЗИКЕ в ВУЗ'ы и пр. учебн. зав. успешно готовит учитель **Белкин** (многолетняя практика) Раковская, 4, кв. 15.

50 К. кошт публікацыі аб згубе дакумента

Прыймо абвестак у чарговы нумар газэты да 2 гадзіны дня

БЕЛАРУСКАЕ ДЗЯРЖАЎНАЕ ВЫДАВЕЦТВА

ДРУКУЮЦЦА І ХУТКА ВЫЙДУЦЬ:

1. ВАРАШЫЛАЎ— СТАЛІН І ЧЫРВОНАЯ АРМІЯ.

2. СЫЧОЎ— ПАД ЧЫРВОНЫМ СЬЦЯГАМ.

Учэбная кніга для чырвонаармейца і дапрызыўнікаў. Падручнік для палітзаняткаў.

ЗАВОЧНЫЯ КУРСЫ БУХГАЛЬТЭРЫІ

Курсы рыхтуюць работнікаў для нізавых каапэрацыйных арганізацый, крэдытных таварыстваў, арцеляй усіх відаў, калгасаў, саўгасаў і г. д.

Тэрмін навучаньня 8 месяцаў.

Прымаюцца асобы з адукацыяй ня нізэй 4 груп сямігодкі. Прыём адбываецца круглы год.

Скончыўшыя курсы атрымліваюць адпаведнае пасьведчаньне.

Плата за курс 33 руб. уносіцца так: 9 руб. пры паступленьні, з якіх 4 руб. залічваюцца за 8 месяц і па 4 руб. штомесячна ў па чатку можнага навучальнага месяцу. Умовы прыёму высылаюцца за 2 дваісяцікапечныя маркі.

Грошы пераводзяцца на адрасе: Менск, Усенабанк, бяг. рахунак № 68... Усю карэспандэнцыю накіроўваць: Менск Усенабанк, Завочным курсам.

Для здачы **АБВЕСТКІ** ў газэту **„ЗЬВЯЗДА"** звяздаю па тэл. **7-81**